Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ВЕРАСЕНЬ 15 1933 г. ПЯТНІЦА № 204 (4748) Год выданьня XVII

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: Перадавая—Самы кароткі ў сьвеце рабочы дзень зробім самым прадукцыйным. Разгром сабатажнікаў — першая і рашучая задача палітаддзелаў чыгункі. І. М. ФЭЛЬДМАН—Умацаваць савецкі гандаль. Выязная рэд. «Зьвязды»: А. ЛЕВІН, Я. ЛОМАХ, БАГУН і інш. — У барацьбе за высокую якасьць дарожных работ.
У Шклове, Чачэрску і Бабруйску злачынна адносяцца да прыёмкі і аховы дзяржаўнага збожжа.
Плян мабілізацыі сродкаў выканан толькі на 72 проц.
ЗА МЯЖОЙ:
Крах вымыслаў Эрта.
У ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ—Дэмагогія замест дапамогі. Адкрытая прапаганда вайны.
Залва Эрыа.
П'ер Кот прыбыў у СССР.

Самы кароткі ў сьвеце рабочы дзень зробім самым прадукцыйным

Савецкі саюз — адзіная краіна ў сьвеце, дзе ўведзен 7-гадзінны рабочы дзень. Гэта — непасрэдны вынік дыктатуры пралетарыяту, вынік вялікіх заваяваньняў рабочай клясы.

7-гадзінны рабочы дзень паляпшае эканамічны дабрабыт і культурнае становішча рабочых, узьнімае прадукцыйнасьць працы і тым самым стварае прадпасылкі для яшчэ большых тэмпаў разьвіцьця нашай народнай гаспадаркі. Таму пераход на 7-гадзінны працоўны дзень патрабуе максымальнага яго ўшчыльненьня, максымальнай яго прадукцыйнасьці.

Самы кароткі ў сьвеце рабочы дзень у краіне, будуючай сацыялізм можа і павінен быць самым прадукцыйным — вось баявы дэвіз, з якім рабочая кляса краіны Саветаў паступова скарачае свой рабочы дзень.

Перадавая калёна пралетарыяту СССР, рабочыя гор. Леніна (завод «Электросіла») першымі кінулі лёзунг: **працаваць поўных 7 гадзін на пралетарскую дзяржаву.** Гэты баявы кліч ленінградцаў павінен стаць здабыткам усёй рабочай клясы.

Для работы нашай беларускай прамысловасьці пытаньне ўшчыльненьня рабочага дня **мае выключнай важнасьці значэньне.** Беларуская прамысловасьць у першым годзе другой пяцігодкі ідзе з глыбокімі прарывамі па выкананьні пляну. Асабліва дрэнна—з якаснымі паказальнікамі. Дырэктывы студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), каб «сканцэнтраваць у 1933 годзе галоўную ўвагу на поўным выкананьні заданьня па прадукцыйнасьці працы і зьніжэньні сабекошту», беларускай прамысловасьцю ня выкананы.

Аднэй з важнейшых прычын прарываў у рабоце прамысловасьці Беларусі зьяўляецца далёка няпоўная загрузка рабочага дня, а адсюль і нізкая прадукцыйнасьць працы. Мы невыстарчальна скарыстоўваем свой рабочы час, шмат рабочых гадзін растрачваецца на прастоі. Вось характэрны прыклад. Фотаграфія рабочага дня токара Эльтэрмана па заводзе імя Варашылава паказала, што рабочы патраціў 31 мінуту, каб адшукаць і падабраць патрэбны для яго работы патрон, 50 мінут затрачана на хаджэньне ў інструмэнтальную за сьвердламі і іх заточку. Інструктаж у часе работы з боку майстра заняў 28 мінут. Брак з-за цьвёрдага матар'ялу, дрэннага інструманту і нізкай кваліфікацыі самога токара выклікалі 68 мін. прастою. Непатрэбныя хаджэньні па цэху і гутаркі з таварышамі затрацілі 42 мін. і г. д. Адным словам з 7 гадз. рабочага дня токара, растрачана, як непрадукцыйны час, 4 гадз. 10 мін., або звыш паловы рабочага дня.

Што паказвае гэта фотаграфія рабочага дня? Яна выразна сьведчыць аб недапушчальна-дрэннай арганізацыі работы. Пераважная частка непрадукцыйнага часу падае на мітусьню ў пошуках інструманту, на нізкую якасьць матар'ялаў, на слабую падрыхтаванасьць варштатаў. Гэта фотаграфія паказвае і на недапушчальную працоўную дысцыпліну. 42 мінуты патрачаны на непатрэбныя хаджэньні і гутаркі з таварышамі. Такія выпадкі не адзінкавыя. Нават на нашых перадавых прадпрыемствах вельмі часта паасобнымі рабочымі праца пачынаецца праз 15-20 мінут пасьля гудка, настолькі-ж, а то і больш канчаецца раней тэрміну.

Хто дае права разбазарваць рабочы час? Даюць гэтаму права многія партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі прадпрыемстваў, якія яшчэ слаба вядуць барацьбу за ўмацаваньне пралетарскай жалезнай дысцыпліны.

З рук вон дрэнна пастаўлена на радзе прадпрыемстваў унутры-заводзкае плянаваньне і тэхнічнае нармаваньне, што зьяўляецца аднэй з галоўных прычын злачыннага разбазарваньня каштоўнага часу. Колькі прастояў рабочых, машын траціцца толькі таму, што мы яшчэ не навучыліся вызначыць магчымую і поўную норму рабочаму, машыне, каб скарыстаць максымальна вытворчую магутнасьць нашай новай, створанай за першую пяцігодку, тэхнікі?

Колькі дарэмна траціцца рабочага часу толькі таму, што мы ня ўмеем паставіць на належную вышыню справу ўнутры-заводзкага плянаваньня, справу арганізацыі вытворчасьці? Вось, напрыклад, фанерны цэх фабрыкі «Вэзувій». Як паведамляе рабкор, сушыльны прэс № 1, замест 90 зваротаў 3-мілімэтравай фанеры дае 50-60, прэс № 2 (пры ручным заціску) замест 50 дае 30-40 зваротаў. Або вось яшчэ прыклад. На фабрыцы «Х-ты Кастрычнік» 22 жніўня першая зьмена зьдымальнай машыны № 15 не працавала паўдня. Работніца Грэбенчык тры разы гаварыла аб гэтым загадчыку цэху, але толькі ў канцы дня быў прыслан вучань для агляду машыны. Вельмі часты бываюць прастоі ў зьдымальным цэху фабрыкі «Пралетарская перамога» з-за адсутнасьці касотак і інш. Толькі за адзін жнівень па фабрыцы імя «КІМ» налічваецца прастою каля 159-323 машына-гадзін. 10 верасьня ў швейна-пецельным цэху гэтай-жа фабрыкі ўвесь дзень прастаялі 120 машын, а ў вязальным цэху (у другой зьмене) не працавалі 524 машыны. Пытаемся, хто дае права так злачынна разбазарваць рабочы час, злачынна адносіцца да скарыстаньня дорага каштуючага абсталяваньня? Пара ўжо глядзець гаспадарнікам, партыйным і прафсаюзным арганізацыям на мінуты ня толькі па гадзіньніку, але і па варштатах, па машынах. **Мінута работы машыны, варштата — гэта ўжо дэталі, мілімэтры зьнятай стружкі, мэтры гатовай тканіны, гэта прадукцыя.**

Няпоўная нагрузка рабочага, машыны, іх прастоі недадаюць пралетарскай дзяржаве на мільёны рублёў прадукцыі.

Першачарговая задача партыйна-прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый — наладзіць справу ўнутрызаводзкага плянаваньня і тэхнічнага нармаваньня, скарыстаць скрытыя рэзэрвы ўшчыльненьня рабочага дня, узьняць прадукцыйнасьць працы.

Абвешчаная па ініцыятыве перадавых рабочых фабрыкі «ДЗЬВІНА» ўсебеларуская пераклічка па рэалізацыі пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК аб рабоце прамысловасьці павінна паслужыць магутным фактарам мабілізацыі ўсяго рабочага калектыву і ІТР на ўшчыльненьне рабочага дня.

Пераtварыць мільёны непрадукцыйных гадзін у машыны, варштаты, вопратку, абутак і г. д. — важнейшая задача сёньняшняга дня. Барацьба за поўнацэнныя 420 мінут у зьмену — гэта барацьба за тэмпы нашага руху наперад, барацьба за далейшае паляпшэньне матар'яльнага становішча і культурна-бытавых умоў рабочай клясы.

Вялікі пачын ленінградзкіх рабочых ужо знайшоў свой водгук сярод пралетараў Савецкай Беларусі. На фабрыцы «Камінтэрн» (Гомель) партгрупа брыгады фармоўшчыкаў правяла значную работу па ўшчыльненьні рабочага дня. У выніку гэтага рабочыя Разоўскі, Іцкоў і інш., якія раней працавалі 5-6 гадзін, зараз працуюць поўнасьцю 7. Павысілася выкананьне іх заданьня (1 верасьня заданьне выканана на 107 проц., 4 верасьня — на 118 проц.). Таксама ў лесацэху камбінату імя тав. ГІКАЛО рабочыя ўзяліся за ўшчыльненьне рабочага дня. У часе перапынку штодзенна праводзяцца 5-мінутныя нарады, на якіх абмяркоўваюцца пытаньні аб папярэджаньні прастояў.

Але гэта яшчэ адзінкавыя факты. Задача партыйна-прафсаюзных арганізацый — узначаліць бальшавіцкі паход шырокіх рабочых мас за правільную арганізацыю працы, за барацьбу са стратамі рабочага часу, за максымальнае ўшчыльненьне рабочага дня. **Пара ўжо ад агульных разважаньняў па гэтым пытаньні перайсьці да канкрэтных спраў.** Па прыкладу рабочых г. Леніна трэба зараз-жа самым дасканалым чынам выявіць на што і як расходуецца рабочы дзень. Выявіць недахопы ў арганізацыі працы і зарплаце, ва ўнутрызаводзкім плянаваньні і тэхнічным нармаваньні, у рабочым забесьпячэньні, па-бальшавіцку ўзяцца за іх зьнішчэньне — у гэтым зараз павінна заключацца работа партыйных і прафсаюзных заводзкіх арганізацый.

Зрабіць здабыткам кожнага рабочага заклік «Правды»: **«7 гадзін да адзінай мінуты павінен аддаваць кожны рабочы вытворчасьці, рабоце, бо чым больш пасьпяховай будзе яна, тым лепшай будзе якасьць прадукцыі, тым больш мы выпусьцім яе, тым лепш мы выканаем плян першага году другой пяцігодкі і даб'емся далейшага паляпшэньня дабрабыту рабочага, бо мы працуем не на гаспадара, не для капіталіста, а для нашай вялікай Савецкай краіны, для нашай пралетарскай дзяржавы, для працоўных Савецкага Саюзу».**

У Чавусах сабатуюць сяўбу пшаніцы

ЧАВУСЫ. 10 дзён таму назад у раён прыбыла 50 тон гатунковай азімай пшаніцы. Але чамусьці пшаніца ляжыць на станцыі. Калгасы абмянялі толькі 10 тон. Напрыклад, калгасы Зарэсьцянскага сельсавету павінны абмяняць 45 цэнтн., а пакуль ня ўзялі ні аднаго. Тое-ж самае і ў Ваўкавіцкім і Амхініцкім сельсаветах.

У раёне наглядаецца сабатаж сяўбы пшаніцы. З 50 гектараў амаль нічога не засеяна, а насеньне гатунковай пшаніцы так і застаецца ляжаць на складзе.

Ня лепш і з абменам гатунковага жыта. Больш месяца таму назад у раён прыбыла 60 тон гатунковага жыта, на 12 верасьня калгасы абмянялі толькі 20 тон. Гэта вельмі мала непакоіць загадчыка райзямаддзелу Сватковскага і старшыню РВК Адамчука. Яны сядзяць і чакаюць, пакуль калгасы самацёкам разьбяруць гатунковае насеньне.

П. С.

У САЦСПАБОРНІЦТВЕ УПЕРАДЗЕ ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЬЦЬ

НЕАДКЛАДНА ЗАВЯРШЫЦЬ УБОРКУ, ЦЕРАБЛЕНЬНЕ, АБМАЛОТ, РАСЬЦІЛ ІЛЬНУ І СЯЎБУ АЗІМЫХ, РАЗГАРНУЦЬ МАСАВАЕ КАПАНЬНЕ І АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ

БССР
НА 10-е ВЕРАСЬНЯ

Зжата збожжавых	—80,8 проц.
Зьвезена „	—91, „
Абмалочана „	—35,6 „
Выцераблена ільну	—86,4 „
Засеяна азімых	—37,4 „
Выканан гадавы плян збожжапаставак на	46,4 „

ЗАХ. ВОБЛАСЬЦЬ
НА 10-е ВЕРАСЬНЯ

Зжата збожжавых	—81 проц.
Зьвезена „	—84,5 „
Абмалочана „	—61,6 „
Выцераблена ільну	—97 „
Засеяна азімых	—76,7 „
Выканан гадавы плян збожжапаставак на	52,4 „

НА ПОЛІ НЯМА БАЛЬШАВІЦКАГА ВОКА

БАБРУЙСК. (Ад наш. кар.).

У старшыні Каменскага сельсавету **Манькевіча** запыталі:

— Калі Каменка скончыць сяўбу?

Манькевіч не задумваючыся адказаў: «Да першага кастрычніка, мабыць, скончым».

Гэты адказ характэрны для практыкі большасьці сельсаветаў Бабруйшчыны. **І сапраўды на 10 верасьня плян сяўбы па раёне выканан толькі на 21 проц.** Прырост за пяцідзёнку дасягае ўсяго 10 проц.

Зацягваньне сяўбы апартуністычныя элемэнты спрабуюць апраўдваць «мокрым надвор'ем», «адсутнасьцю падрыхтаванай зямлі». Гэтыя «мокрыя» тэндэнцыі даволі распаўсюджаны ў Бабруйшчыне, не сустракаюць адпору.

Возьмем той-жа самы Каменскі сельсавет. З 750 га азімых па сельсавеце засеяна калгасамі 75 га, а аднаасобнікамі 140 га. Пшаніцы яшчэ зусім ня сеялі. Антыпшанічныя настроі ня толькі ў Каменцы, але і ў іншых сельсаветах. З 1.800 га пшаніцы па раёне ледзь засеяна 10 проц.

Раённыя арганізацыі ў тым ліку і РК КП(б)Б, замест канкрэтнага аператыўнага кіраўніцтва сяўбой непасрэдна на полі займаюцца засядацельскай мітусьнёй. Сёньня сухі сонечны дзень. І вось замест таго, каб быць у сельсавеце, брыгадзе, кіраўнікі раёну выклікаюць за дзесяткі кілёмэтраў старшынь сельсаветаў, калгасаў, сакратароў парт'ячэек «для дакладу» на бюро РК КП(б)Б аб сяўбе і ўборцы.

Да чаго прыводзіць адрыў ад работы нізавога зьвяна, можна пераканацца з практыкі калгасу «Чырвоная Букіна». Старшыня калгасу **Альшэўскі** па выкліку паехаў у горад, дзе прабыў тры дні. У калгасе-ж тым часам зусім спынілася сяўба. Насеньне жыта для пасеву поўнасьцю яшчэ не намалочана, а 200 пудоў намалочанага ляжыць неадсартаваным.

Для дапамогі вясковым арганізацыям у праведзеньні сяўбы РК КП(б)Б мабілізаваў 30 чалавек партактыву, але большасьць мабілізаваных засталіся ў горадзе.

Пасьля прыведзеных фактаў робіцца ясным, чаму сяўба азімых у Бабруйшчыне ідзе самацёкам, чаму ігнаруецца сяўба пшаніцы. На полі няма бальшавіцкага вока, бабруйскія кіраўнікі адседжваюцца ў канцылярыях.

П. Арцельны.

Раёны, якія зрываюць уборку яравых

(Убрана ў процантах на 10 верасьня)

РАЁН	Зжата яравых	Зьвезена ў проц. да зжатага
1. Бешанковіцкі	24,9	45,9
2. Асьвейскі	25,3	45,6
3. Віцебскі	31,2	54,1
4. Гарадоцкі	32,2	50,9
5. Лоеўскі	34,5	62,7
6. Дубровенскі	35,1	49,7

Сяўба азімых па БССР

на 10-е верасьня

РАЁН	Засеяна ў гект.	Проц. выкан.
1. Чэрыкаўскі	1.367	85,4
2. Лельчыцкі	7.094	74,7
3. Полацкі	14.738	69,4
4. Аршанскі	18.000	68,4
5. Барысаўскі	12.491	62,5
6. Дрысенскі	7.798	61,9
7. Парыцкі	11.128	58,0
8. Бялыніцкі	9.627	55,6
9. Крычаўскі	5.601	55,5
10. Віцебскі	6.816	54,7
11. Асьвейскі	3.569	54,1
12. Чырвона-Слабодзкі	5.301	51,5
13. Смалявіцкі	8.493	48,0
14. Касьцюковіцкі	13.788	47,9
15. Менскі	9.451	47,3
16. Вузьдзенскі	5.255	47,3
17. Магілеўскі	12.309	46,4
18. Прапойскі	7.194	45,5
19. Бягомльскі	5.483	45,3
20. Чачэрскі	5.985	44,0
21. Хойніцкі	5.333	43,8
22. Камарынскі	2.752	43,7
23. Мазырскі	11.979	41,8
24. Чэрвеньскі	7.608	41,8
25. Гарадоцкі	10.900	41,6
26. Бярэзінскі	7.751	41,2
27. Чавускі	10.934	40,8
28. Слуцкі	9.307	40,6
29. Расонскі	4.929	38,8
30. Сіроцінскі	5.205	37,7
31. Кармянскі	6.295	37,5
32. Шклоўскі	8.196	37,2
33. Вушацкі	8.713	36,2
34. Быхаўскі	9.885	36,2
35. Старобінскі	4.646	36,2
36. Брагінскі	4.432	35,7
37. Талочынскі	8.733	35,6
38. Глускі	6.325	34,6
39. Лепельскі	5.802	34,2
40. Пятрыкоўскі	5.515	34,0
41. Гомельскі	3.077	33,8
42. Рэчыцкі	7.249	33,7
43. Сураскі	3.562	33,6
44. Лоеўскі	3.459	32,6
45. Горацкі	8.197	32,5
46. Ельскі	3.450	32,5
47. Жлобінскі	6.841	31,0
48. Дубровенскі	4.509	30,7
49. Жыткавіцкі	1.862	30,5
50. Сеньненскі	4.717	30,4
51. Дзяржынскі	5.157	30,2
52. Клімавіцкі	6.264	30,1
53. Веткаўскі	7.294	29,9
54. Лёзьненскі	1.379	29,6
55. Бешанковіцкі	4.493	29,4
56. Цэрахаўскі	5.337	29,3
57. Уваравіцкі	4.520	28,8
58. Пухавіцкі	7.673	28,5
59. Нараўлянскі	3.203	27,9
60. Мсьціслаўскі	5.902	27,2
61. Капыльскі	5.734	26,8
62. Клічаўскі	3.851	23,9
63. Рагачоўскі	6.791	23,7
64. Любаньскі	2.510	22,8
65. Чашніцкі	3.195	21,7
66. Плешчаніцкі	2.863	21,7
67. Бабруйскі	5.724	20,4
68. Крупскі	3.932	20,3
69. Старадарожскі	2.609	20,2
70. Б.-Кашалеўскі	2.222	19,7
71. Заслаўскі	2.283	18,1
72. Лагойскі	2.119	14,4
73. Асіповіцкі	1.508	13,3
74. Тураўскі	591	11,8
75. Чырвонапольскі	1.572	9,4
Па БССР:	474.630	37,4

ПЕРАХОДНЫЯ СЬЦЯГІ ПЕРАДАНЫ ВЕТКАЎСКАМУ, СЕНЬНЕНСКАМУ І БАРЫСАЎСКАМУ РАЁНАМ

Пастанова камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласьцю

1. Пераходны сьцяг ЦК КП(б)Б, заваяваны ВЕТКАЎСКІМ раёнам, замацаваць за апошнім. Папярэдзіць кіраўніцтва Веткаўскага раёну, калі на працягу бліжэйшай пяцідзёнкі ня будуць дасягнуты больш высокія тэмпы па сяўбе азімых і ўборцы яравых—сьцяг будзе адабран і перадан іншым, ідучым уперадзе раёнам.

Кандыдатамі, якія аспрэчваюць пераходны сьцяг у Веткаўскага раёну, зьяўляюцца: КАМАРЫНСКІ, СЛУЦКІ І ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІ раёны.

2. Па групе ільнаводчых раёнаў пераходны сьцяг, адабраны ў Шклоўшчыны, перадаць СЕНЬНЕНСКАМУ раёну, які поўнасьцю закончыў церабленьне ільну, выканаў 143 проц. гадавога пляну збожжапаставак і 35 проц. загатовак ільнанасеньня. Кіраўніцтва Сеньненшчыны папярэджана, што калі ў бліжэйшую пяцідзёнку раён не даб'ецца завяршэньня абмалоту і расьцілу ільну, сьцяг будзе адабран і перадан іншым, больш перадавым раёнам. Кандыдатамі на пераходны сьцяг па групе ільнаводчых раёнаў зьяўляюцца: Дрысенскі і Полацкі раёны.

3. Замацаваць пераходны сьцяг ЦВК БССР за БАРЫСАЎСКІМ раёнам, які па ўсіх паказальніках ідзе ў першых радох па выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній.

Скарыстаць кожную гадзіну добрага надвор'я

МАГІЛЕЎ. (Па тэлеграфу). Буйнейшы ў раёне калгас **«Камінтэрн»** паказвае ўзор таго, як трэба спалучаць уборку з абмалотам і выкананьнем збожжапаставак.

У калгасе разгорнута барацьба за скарыстаньне кожнай гадзіны добрага надвор'я. Сілы калгасаў разьбіты так, што адначасова ідзе сушка збожжа на палёх і звозка ў гумны. Снапы разьвязваюцца, прасушваюцца і на працягу круглых сутак звозяцца ў гумны. Круглыя суткі ідзе малацьба на складанай малатарні. Гадавы плян збожжапаставак па жыту і ячменю выканан поўнасьцю.

Слаба разгортваецца сяўба азімых. Засеяна толькі 118 гектараў з 200, вызначаных паводле пляну.

Мінуцкі.

Усебеларуская чырвоная дошка

«Сацыялістычнае спаборніцтва гаворыць: Дапамагай адстаўшым, даганяй лепшых і дабіся агульнага ўздыму» (СТАЛІН)

По прадстаўленьні палітаддзелу Рагачоўскай МТС заносіцца на Усебеларускую чырвоную дошку:

КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА, Запольскага сельсавету, Рагачоўскага раёну.

Гадавы плян пастаўкі збожжа дзяржаве калгас выканаў поўнасьцю і датэрмінова. Калгас разьлічыўся з МТС, здаўшы поўнасьцю натуралату.

Пасьля выкананьня ўсіх абавязацельстваў перад дзяржавай і ссыпкі насенфондаў на працадзень калгасьнік атрымлівае па 5,6 кгр. збожжавых, 16 клгр. бульбы і 2 кгр. гародніны, у той час як летась калгасьнік атрымаў па 2,6 кгр. збожжа і па 9,5 кгр. бульбы. Такіх вынікаў ён дабіўся таму, што добра правёў барацьбу са стратамі ў часе ўборкі.

Лепшыя ўдарнікі калгасу: **Камісараў** — брыгадзір паляводчай брыгады, **Ахраменкаў М.** — старшыня калгасу і **Губскі М.** — сакратар парт'ячэйкі.

По прадстаўленьні Слуцкага РК КП(б)Б заносіцца на Усебеларускую чырвоную дошку:

КАЛГАС «ЧЫРВОНАЯ ВЕСЕЯ», Прошчыцкага сельсавету, Слуцкага раёну.

Калгас «Чырвоная Весея» 23 жніўня датэрмінова выканаў гадавое абавязацельства па збожжапастаўках.

Уборка закончана ў вызначаныя тэрміны, усё збожжа зьвезена ў гумны. На ўсіх жнятварках былі прыстасаваны зерняўлоўнікі. На палёх калгасу праведзена падграбаньне каласоў, пры актыўным удзеле калгаснай дзетвары на чале з піянэрамі.

Пасьля выкананьня ўсіх абавязацельстваў перад дзяржавай і ссыпкі насенных і кармавых фондаў на працадзень кожны калгасьнік атрымаў 3,5 кгр. збожжа і 12 кгр. бульбы.

Старшыня калгасу **СІНІЦА.**
Старшыня рэвізійнай камісіі **КЛІМЕНКА.**
Лепшыя калгасьнікі ўдарнікі — **БЕРАЗОЎСКІ АНДРЭЙ** — конюх, **СІНІЦА** — старшыня калгасу, калгасьнікі: **ГУБЧЫК, КАРЦЕЛЬ, ШУСТАР.**

Азімы клін пустуе

ГОРКІ. Горацкі раён злачынна зацягвае сяўбу азімых. На 10 верасьня засеяна ўсяго 32,5 проц. азімага кліну. У большасьці калгасаў раёну сядзелі і чакалі «прачыстай», а пасьля «прачыстай» пачаліся «мокрыя настроі». У калгасах «Беларусь», «Ленінскі шлях», «Новы шлях» і інш. за апошні час зусім аслабла працоўная дысцыпліна. На работу ў гэтых калгасах выходзяць толькі ў 9-10 гадзін раніцы, а ў 6 гадзін ужо варочаюцца з поля. Калі ўлічыць яшчэ перапынак на абед, дык для работы зусім не застаецца часу.

Спробам кляса-варожых элемэнтаў зацягнуць сяўбу з боку РК і РВК не даецца адпору. У калгасе «Беларусь» са 160 га засеяна ўсяго 9 га, у калгасе імя Варашылава з 90 га засеяна 15. У калгасе «Чырвоная зорка» замест 130 га засеяна толькі 8,4 га.

Дрозд.

Разгром сабатажнікаў—першая і рашучая задача палітаддзелаў чыгункі

Перабудова работы чыгуначнага транспарту БССР праходзіць недапушчальна марудна. Бальшавіцкага парадку, выразнай баявой работы, такой, якой патрабуе партыя і ўрад на чыгунцы далёка яшчэ няма. Гэта ёсьць просты вынік таго, што сабатаж яшчэ квітнее ў большасьці зьвеньняў чыгункі, што з ім не вядзецца жорсткай барацьбы, што старыя канцылярска-бюракратычныя мэтады работы і кіраўніцтва ня выгнаны з транспарту.

ЦО партыі «Правда» выкрыла рад фактаў адкрытага і замаскаванага сабатажу пастановы ЦК і СНК па чыгунках БССР. Сыгналы «Правды» павінны былі паслужыць сур'ёзным урокам для ўсіх чыгуначных і тэрытарыяльных партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый БССР. Іх трэба было скарыстаць для таго, каб мабілізаваць найшырэйшыя масы чыгуначнікаў на канчатковы разгром сабатажу, на рашучы ўздым работы чыгункі.

Што-ж мы маем на справе? На справе большасьць арганізацый не зрабіла для сябе бальшавіцкіх высноў. Не зрабілі, як відаць гэтых высноў і тыя арганізацыі, якіх у першую чаргу датычыла крытыка «Правды» (Гомельскае дэпо). Гэта-ж факт, што да гэтага часу работа фактычна не перабудавана, што сабатаж, кругавая парука, «очковтирательство» працягваюцца. Лепшым пацьверджаньнем гэтага служыць тое, што рад важнейшых вытворчых паказальнікаў да гэтага часу ня выконваецца.

Вось толькі некалькі прыкладаў, якія характарызуюць ганебную работу чыгункі. Возьмем працдысцыпліну — важнейшы паказальнік, якому ў пастанове ЦК і СНК адводзіцца значнае месца. Трэба проста сказаць, што ў гэтай справе ёсьць глыбокі прарыў. У ГОМЕЛЬСКІМ дэпо выпадкі аварый і паўторнасьці бываюць амаль кожны дзень. Ня зьнішчаны зрывы спаранай. Па ВІЦЕБСКІМ раёне графік сьледаваньня цягнікоў выканан у жніўні толькі на 64 проц., за чатыры дні верасьня з 480 таварных цягнікоў 173 адпраўлены са спазьненьнем у сярэднім па 1 гадз. 21 мін. кожны. Вінаватыя ў зрывах адпраўленьня цягнікоў не нясуць адказнасьці і часта застаюцца зусім нявыяўленымі. Па гэтым-жа раёне ў жніўні было шмат здарэньняў (нават больш чым у ліпені) — 70 спыненьняў у пуці, 26 разрываў цягнікоў, 5 выпадкаў праезду закрытых сэмафораў і г. д.

Ці патрэбны больш пераканаўчыя доказы злачыннага становішча з перабудовай работы, з працоўнай дысцыплінай? Нічога дзіўнага ў гэтым няма, калі ўлічыць, што новы дысцыплінарны статут зусім не скарыстоўваецца мясцовымі арганізацыямі для ўздыму пралетарскай дысцыпліны на транспарце, што замест бальшавіцкай мабілізацыі мас вакол новага статуту, прапрацоўка яго праходзіла фармальна, па-чыноўніцку.

А вось работа АРШАНСКАГА раёну. За трэцюю дэкаду жніўня сьледаваньне таварных цягнікоў па раскладу выканана на 77,4 проц., а пасажырскіх — на 66,9 проц. Астача вагонаў пад выгрузкай пры заданьні 16 проц., складала 65,5 проц. Заданьне па звароту вагона ў жніўні было выканана толькі на 82 проц. Лічбы гавораць самі за сябе. Ня лепш (а па раду паказальнікаў нават горш) справа і ў ЖЛОБІНСКІМ раёне. Аднак, нельга сказаць, каб гэта асабліва турбавала кіраўніцтвы чыгуначных раёнаў, партыйныя, гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі. Ва ўсякім выпадку бальшавіцкай барацьбы за кожны процант пляну, які патрабуецца ад бальшавіцкага транспарту, яшчэ ня відаць. У МАГІЛЕЎСКІМ дэпо (начальнік — ГЕРАШЧАНКА, сакратар партколу — БЕРЗІН) за жнівень было 95 паўторных рамонтаў. Рэкордная лічба! У зводках, праўда, лічылася ўсяго 8. Сакрэт зразумелы — хітрасьць «очковтирателей». Аб рабоце дэпо можна меркаваць яшчэ і па тым, што за адзін дзень былі разьбіты два паравозы. Вакол гэтых абураючых фактаў ня была ўзьнята ярасьць мас, парушальнікаў працдысцыпліны не акружылі грамадзкай ганьбай. Замест гэтага начальнік дэпо Герашчанка агідную работу дэпо імкнецца апраўдаць нерэальнасьцю трайфінпляну. У гэты час Герашчанка прагледзеў, што дэпо знаходзіцца фактычна ў палоне кляса-чужых элемэнтаў, што тут зьвілі сабе цёплае гнёздышка і жандары, і папы, і кулакі, і інш. антысавецкія элемэнты, якія шкодзілі ў рабоце. Наўрад ці можна адшукаць больш абураючы прыклад палітычнай сьлепаты.

У ЖЛОБІНЕ сыстэматычна адпраўляюцца цягнікі з перавышанай вагой. У выніку масавыя астаноўкі ў пуці, разрывы і г. д. З гэтым ніякай барацьбы не вядзецца. Да такіх фактаў чыноўнікі транспарту ўжо прывыклі...

Ці можна пасьля ўсіх прыведзеных фактаў гаварыць, што перабудова праведзена, што ўсё ў парадку? Лішне даказваць усю беспадстаўнасьць такіх цьверджаньняў.

Зарплата — адна з найбольш сур'ёзных вагароў хутчэйшай перабудовы транспарту, уздыму яго работы. Ці перабудавана яна так, як гэтага патрабавала пастанова ЦК і СНК? Нажаль не. Аб гэтым сьведчаць шматлікія сыгналы з месц. 5 верасьня «Зьвязда» ў артыкуле «Пад шырмай прыгожых фраз» на фактах з МЕНСКАГА вузла разгорнута паказала, як сабатуецца пастанова ЦК і СНК аб зарплаце. Падобных фактаў ня мала. У ступенчатым і старым паравозным дэпо ГОМЕЛЬ, у ВІЦЕБСКІМ паравозным дэпо перабудова сыстэмы зарплаты і нармаваньня працы праводзіцца няправільна. Гэта работа перадаверана расцэншчыкам, якія бяздзейна адносяцца да яе. Начальнікі дэпо, майстры і брыгадзіры стаяць у баку ад гэтай важнейшай справы. У выніку — рад скажэньняў. У ВІЦЕБСКУ, напрыклад, «узбуйненьне» норм праведзена так, што з 7.214, пакінулі... 3.221. Якая была блытаніна, такая і засталася. Зараз ідзе зноў перагляд іх. Расцэнкі складзены няправільна. Работу прыходзіцца пачынаць спачатку. У МАГІЛЕЎСКІМ дэпо не прэміруюцца прыёмачныя брыгады за выкрыты нядобраякасны рамонт.

Зараз па чыгунцы пашлі адказнейшыя грузы — збожжа, бульба, гародніна. Найбольш рацыянальнае скарыстаньне кожнага вагона, недапушчэньне прастою іх лішняй хвіліны, своечасовая падача добраякасных вагонаў і арганізацыя баявой работы на пагрузачна-разгрузачных пунктах, захаваньне грузаў ад псаваньня і раскрадваньня — такія ёсьць асноўныя патрабаваньні да чыгункі. Трэба сказаць, што гэтыя патрабаваньні выконваюцца зараз дрэнна. Чыгунка яшчэ не спраўляецца з адказнейшымі задачамі, якія на яе ўскладзены. Значнае перавышаньне нормы астачы вагонаў пад выгрузкай назіраецца па ўсіх раёнах. Прастоі ўвайшлі ў сыстэму. Надзвычай дрэнна арганізаваны пагрузачна-разгрузачныя работы. Барацьба з няспраўнай камэрцыяй не вядзецца. Нельга не адзначыць і таго, што рад раёнаў ня выконвае рэгуліровачных заданьняў, затрымліваючы паражняк, які павінен ісьці на поўдзень. Так, у АРШАНСКІМ раёне ў жніўні быў значна перавышан вагонны парк.

Асабліва дрэнна арганізавана ахова збожжа на чыгунцы. На ст. НІЗКАЎКА, напрыклад, (начальнік САЎНЕНКА) дах галоўнага пакгаузу працякае. Збожжа псуецца, а сродкі, адпушчаныя на рамонт не скарыстаны. Тое-ж самае на станцыі ДЗЕМЯХІ, ДОЧ і інш. На канкрэтных носьбітах антыдзяржаўных адносін да захаваньня збожжа, да паскарэньня пагрузачна-разгрузачных работ трэба нанесьці жорсткі, бязьлітасны ўдар.

Першыя-ж дні работы палітаддзелаў пацьвярджаюць усю іх жыцьцёвасьць. Палітаддзелы ў Аршанскім, Жлобінскім, Віцебскім і Гомельскім раёнах бяруцца за канкрэтныя справы, шчыльна падыходзячы да іх. Калёсавое спаборніцтва, абвешчаная трывога па раёну, выкрыцьцё і выгнаньне з транспарту кляса-чужых элемэнтаў — такавы вынікі першых дзён работы палітаддзелаў. Уперадзе вялізарныя задачы. Справа ідзе аб тым, што «УСЁ СЬМЕЦЬЦЕ МІНУЛАГА ПАВІННА БЫЦЬ НАЧЫСТА ВЫМЕЦЕНА, КАНЦЫЛЯРСКА-БЮРАКРАТЫЧНЫЯ МЭТАДЫ КІРАЎНІЦТВА ТРАНСПАРТАМ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗЛАМАНЫ ДА КАНЦА... НЕАБХОДНА НАСТОЙЛІВА І КЛАПАТЛІВА ПРАЦАВАЦЬ НАД ТЫМ, КАБ ПРЫВІЦЬ ЛЮДЗЯМ НОВЫЯ МЭТАДЫ РАБОТЫ, СТВАРЫЦЬ БАЛЬШАВІЦКІ СТЫЛЬ РАБОТЫ НА ТРАНСПАРЦЕ. («Правда»).

Апіраючыся на моцную сувязь з масамі чыгуначнікаў, на маналітнасьць і баяздольнасьць партыйнай арганізацыі, разгортваючы масава-выхаваўчую работу, бальшавіцкую самакрытыку і сацыялістычнае спаборніцтва не наогул, а па канкрэтных паказальніках, уздымам сьвядомай працоўнай дысцыпліны «на аснове пераканаьня і ідэйна-палітычнага ўздзеяньня», палітаддзелы, як пільнае вока і цьвёрдая рука партыі наладзяць бальшавіцкі парадак на транспарце. «Кожны палітаддзелец павінен ясна ўявіць сабе тую небясьпеку, якая яму пагражае. Самая галоўная з гэтых небясьпек — паддацца руціне, скласьці сваю зброю бальшавіка перад супраціўленьнем кляса-чужых і варожых элемэнтаў, даць засмактаць сябе бюрократычнаму балоту. Барацьба з сабатажнікамі, злодзеямі, рвачамі і лодырамі ёсьць клясавая барацьба».

Ва ўсёй рабоце па перабудове чыгуначнага транспарту павінны аказваць непасрэдную канкрэтную дапамогу тэрытарыяльныя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі і друк. На жаль, да гэтага часу іх дапамога была зусім нязначнай. Ужо час з гэтым пакончыць. Трэба памятаць, што «АСЛАБЛЕНЬНЕ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ, ПЕРАБОІ Ў ЯГО РАБОЦЕ АЗНАЧАЮЦЬ З ПРЫЧЫНЫ ГЭТАГА АСЛАБЛЕНЬНЕ ЎСЁЙ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ, АСЛАБЛЕНЬНЕ І ПАДРЫЎ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ КРАІНЫ». (З пастановы ЦК аб палітаддзелах). Гэтага партыя не дапусьціць. Партыя ўзялася за перабудову чыгуначнага транспарту, за ўздым яго на ўзровень задач сацыялістычнага будаўніцтва, яна яе правядзе, ня гледзячы ні на якія перашкоды.

Чыгуначнікі БССР, пад кіраўніцтвам палітаддзелаў уключайцеся ва ўсебеларускую перадкастрычніцкую вытворчую пераклічку заводаў і фабрык! Дабейцеся права на рапарт аб бальшавіцкім правядзеньні перабудовы работы, аб выкананьні і перавыкананьні вытворчых паказальнікаў!

Псаваньне сена на бабруйскай сенабазе

БАБРУЙСК. (Па тэлеграфу).

У рэзультаце злачынна-нядбайнага захоўваньня, няправільнага сьціртаваньня на Бабруйскай сенабазе пачало псавацца сена.

Канкрэтнымі вінаватымі ў гэтым зьяўляецца інспэктар «Загатзбожжа» Гліпка, спэцыяліст па якасьці сена Кавалевіч і загадчык складу Пушнік.

РайКК-РСІ прыпяты энэргічныя меры да выратаваньня сена.

Вінаватыя прыцягваюцца да адказнасьці. Частка злачынцаў узята пад варту.

Факт псаваньня сена ў Бабруйску павінен паслужыць сыгналам для ўсіх іншых раёнаў БССР. Неабходна неадкладна праверыць, як захоўваецца сена і якасьць сьціртаваньня, каб не дапусьціць псаваньня ні аднаго кілё.

Кулацкае ахвосьце зрывае барацьбу за ўраджай

У калгасе **імя Молатава,** Бярозаўскага сельсавету, Мазырскага раёну, злачынна ігнаруюць элемэнтарныя правілы агратэхнікі.

Сяўба азімых зацягваецца. З 51 га засеяна толькі 20. У калгасе сеюць уручную неачышчаным насеньнем, проста з-пад малатарні. Радковая сяўба не скарыстоўваецца.

Пытаньнямі ўзьняцьця ўраджайнасьці праўленьне калгасу зусім ня цікавіцца. Калгас засьмечан кляса-варожымі элемэнтамі. Сам старшыня калгасу **Бондар Рыгор** раней займаўся спэкуляцыяй, купляй і продажам сьвіней. А на грошы, набытыя ад спэкуляцыі, Бондар пабудаваў сабе добры дом, пакрыў яго жалезам. Або ўзяць Васіля Герасімава. Да ўступленьня ў калгас ён меў крупадзёрку, малатарню, пасеку пчол на 50 калод. Уступіўшы ў калгас, яны вядуць дэзарганізуючую работу і імкнуцца разваліць калгасную гаспадарку.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОЎ ЛІПЕНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК І ЦКК АБ РАБОЦЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

АДЗНАЧЫЦЬ ПЕРАКЛІЧКУ ЎМАЦАВАНЬНЕМ ТЭХНІЧНАГА КІРАЎНІЦТВА У НІЗАВЫХ ВЫТВОРЧЫХ ЗЬВЕНЬНЯХ

МЕСЦА ІНЖЫНЭРА І ТЭХНІКА—У ЦЭХУ, НА КАНКРЭТНЫМ ВУЧАСТКУ РАБОТЫ

Чакаюць дадатковых інструкцый

ВІЦЕБСК, (ад спэцыяльнай брыгады «Зьвязды»).

«Больш паўгода, як з трэсту на нашу фабрыку ніхто не паказваецца. Калі-б не настойлівыя патрабаваньні трэсту аб дачы яму ўсякіх вестак, мы бы аб яго існаваньні нават ня ведалі», — так характарызуюць работу Белтэкстыльтрэсту работнікі панчошнай фабрыкі імя Клары Цэткін.

Па панчошнай фабрыцы імя КІМ, куды з трэсту таксама ніхто не заглядваў больш году, да гэтай характарыстыкі дадаюць:

— Тэкстыльны трэст займаецца выключна перадрукоўваньнем усякіх дырэктыў і распараджэньняў Наркамлёгпраму, праўда, зачастую дадае ад сябе нежалькі малазначных фраз.

Гэтыя характарыстыкі як нельга лепш адбіваюць сапраўднае становішча рэчаў. Кіраўніцтва трэсту — габінэтнае, даючае адмоўныя вынікі. Довадаў — шмат.

Возьмем для прыкладу плянаваньне, якое мае выключна сур'ёзнае значэньне, ад якога залежыць бесьперабойная работа фабрык.

Трэці квартал, як вядома, пачынаецца з ліпеня месяца. Кантрольныя лічбы на гэты квартал былі спушчаны трэстам фабрыцы імя Клары Цэткін 29-га ліпеня. Не прайшоў і месяц —а імена 25-га ліпеня, як гэтыя лічбы былі трэстам зьменены ў бок паніжэньня валавой прадукцыі, а ўжо 29-га ліпеня (гэта значыць, роўна праз 4 дні)—новая зьмена кантрольных лічбаў. Дадатковыя ліміты зноў адмяняюцца. І толькі 12-га жніўня кантрольныя лічбы былі трэстам канчаткова зацьверджаны. У выніку такога, з дазволу сказаць «апэрацыйнага» плянаваньня, прамфінплян на трэці квартал быў спушчан у цэхі толькі 23-га жніўня.

Тое-ж самае мы маем і на другой панчошнай фабрыцы імя КІМ.

Прамфінплян на трэці квартал быў спушчан фабрыцы 10-га жніўня. Плянам была прадугледжана перакідка 96 машын з фабрыкі імя Клары Цэткін на фабрыку імя КІМ. Не прайшло і двух тыдняў, як трэст дае новае распараджэньне—пакінуць гэтыя машыны за ф-кай імя Клары Цэткін. Плянаваму аддзелу фабрыкі імя КІМ прыходзілася ўвесь час перакарэктоўваць свае пляны. На гэтым, аднак, справа ня скончылася. 2-га верасьня (зьвярніце ўвагу на дату!) трэст робіць новую зьмену ў кантрольных лічбах...

Калі падвесьці ўсё гэта да адзінага знамянацеля, то атрымаецца, што замест сапраўднага плянаваньня трэст займаецца проста дэзарганізацыяй плянавага вядзеньня вытворчасьці. Што датычыцца спуску кантрольных лічбаў на чацьверты квартал, дык ня гледзячы на тое, што мы ўжо маем 15-е верасьня, з боку трэсту—ні слуху, ні духу.

З плянавым аддзелам «спаборнічае» аддзел спабжаньня. Выключна па пытаньню аб спабжэньні фабрык бязвыездна сядзіць у Маскве прадстаўнік трэсту **Берлін,** які атрымлівае камандыровачныя, сутачныя, а толку вельмі мала. Фабрыкі, не спадзяючыся на прадстаўніка трэсту, пасылаюць за пражай сваіх прадстаўнікоў у тую-ж Маскву.

Аднак, ня гледзячы на шмат «прадстаўніцтваў», пража на фабрыкі паступае з вялікімі перабоямі, што нараджае непамерна вялікія прастоі машын і людзей.

На працягу першага і другога кварталаў на ф-цы імя Клары Цэткін выключна з-за адсутнасьці пражы мелі месца **138.899** машына-гадзін прастою. Па гэтай-жа прычыне фабрыка імя КІМ толькі за адзін жнівень месяц таксама налічвае прастояў 159.323 машына-гадзін.

Або вось яшчэ прыклад «апэрацыйнага кіраўніцтва» тэкстыльтрэсту.

У першых лічбах верасьня панчошная фабрыка імя КІМ атрымала шэсьць вагонаў пражы. У гэты-ж час на фабрыцы імя Клары Цэткін (якая, таксама як і фабрыка імя КІМ, знаходзіцца тут-жа, у горадзе) ня было пражы. У выніку гэтага фабрыка імя Клары Цэткін мела вялікі прастой машын і людзей і прамфінплян ад 102 проц. скаціўся да 60-70 проц.

Яшчэ горш становішча з жыльлёвым будаўніцтвам. Па дамоўленасьці з Белпрамбудтрэстам, апошні павінен у гэтым годзе пабудаваць фабрыцы 4 стандартных дамы, прызначаных для жыльля рабочых, занятых на трыкатажы. З гэтых чатырох дамоў пакуль што распачата пабудова толькі аднаго дому. Між тым, па гэтай прычыне (з-за адсутнасьці жыльлёвых памяшканьняў) на фабрыцы зрываецца набор рабочай сілы. Трэст тут праяўляе паўнейшую пасыўнасьць, грае ролю пабочнага наглядальніка.

Замест таго, каб самім па-бальшавіцку ўзяцца за рэалізацыю пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і аказаць канкрэтную дапамогу фабрыкам у перабудове тэхнічнага кіраўніцтва, мы маем з боку трэсту поўнае ігнараваньне партыйнай дырэктывы па гэтаму пытаньню. Характэрны факт.

Нечакана ў адзін прыгожы дзень фабрыка імя Клары Цэткін атрымлівае ад трэсту распараджэньне скарачыць колькасьць інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў на 16 чалавек. Дырэктар фабрыкі т. Ханіна тут-жа запытвае трэст — за лік якіх аддзелаў праводзіць скарачэньне і як быць з вызваляючайся тэхнічнай сілай. Атрымліваецца ад загадчыка плянавага аддзелу трэста т. Дворкіна даволі «скромны» адказ: «Ламайце самі сабе галаву, гэта справа ваша!» Другі факт. Заг. ТЭС фабрыкі імя КІМ тав. Сьвярдлоў адносна перабудовы тэхкіраўніцтва атрымаў у трэсьце таксама зусім «ясны» адказ:

— «Адносна перабудовы ў нас, у трэсьце, яшчэ ніякіх указаньняў няма, і нічога вам па гэтым пытаньні сказаць ня можам, самі бачыце, што мы таксама чакаем інструкцый адносна перабудовы трэсту».

У рэзультаце такіх бюракратычных адносін, кожная фабрыка праводзіць перабудову сваіх аддзелаў па-свойму, як ім уздумаецца. У гэтым пытаньні адсутнічае адзіная сыстэма, мэтадалёгічнае і тэхнічнае кіраўніцтва.

Пасьля ўсяго гэтага застаецца незразумелым адно: да чаго зводзіцца існаваньне трэсту, якія мэты і задачы ён сабе ставіць? А ўсё-ж такі трэст існуе... У ім кожны дзень мітусяцца чалавек дзесяць інжынэраў і тэхнікаў, такая-ж колькасьць адм.-бухгальтэрскага пэрсаналу і яшчэ 7-8 чалавек служачых сярэдняга і ніжэйшага рангу. Кіраўнікі трэсту — жывыя трупы Мазья, Няўзораў, Дворкін і ўвесь іх мёртвы апарат працягваюць «кіраваць» сваімі прадпрыемствамі, іх прадстаўнік у Маскве Берлін працягвае атрымліваць камандыровачныя, сутачныя і г. д. Усе яны разам сядзяць у сваіх габінэтах, спакойна чакаюць нейкіх дадатковых інструкцый аб перабудове трэсту.

Арк. Зарубежны.
С. Багары.

Поўнасьцю загрузіць рабочы дзень

Сустрэць сьвята XVI гадавіны Кастрычніка пасьпяховым выкананьнем прамфінпляну па ўсіх яго паказальніках — вось лёзунг, з якім мы ўключаемся ва ўсебеларускую перадкастрычніцкую вытворчую пераклічку, абвешчаную «Зьвяздой» па ініцыятыве рабочых фабрыкі «Дзьвіна».

Якое-ж становішча ў нас зараз? Прамфінплян за першае паўгодзьдзе выканан усяго на 96,5 проц. Жнівень ня даў ніякіх зрухаў. Процант выкананьня прамфінпляну па нашым цэху застаўся той-жа самы. Наш цэх — вядучы цэх у сыстэме камбінату. Ад яго залежыць работа ўсіх іншых цэхаў. Таму на нас ускладаецца асабліва адказная задача. Але хто-ж вінават у гэтых прарывах? Усё залежыць ад нас саміх, ад сыстэмы кіраўніцтва вытворчасьцю. Ніякімі аб'ектыўнымі прычынамі, як гэта зусім правільна адзначыла «Зьвязда», тут няма чаго прыкрывацца.

Вось, напрыклад, вялікія перабоі ў рабоце нашага цэху зьяўляюцца вынікам ненармальнага забесьпячэньня сырцом. Мы ніякіх канкрэтных мерапрыемстваў для зьнішчэньня гэтага ня прымаем.

Транспарт у нас таксама вузкае месца. Залежы гатовай прадукцыі па віне транспарту выклікаюць штодзённыя прастоі цэху. Але мы і тут ніякіх захадаў да аздараўленьня работы гэтага вучастку ня прынялі. А дапамагчы тут можна. Вузкакалейка будуецца вельмі марудна, бо не хапае рабочай сілы. Арганізаваць суботнік —першы наш абавязак. Ёсьць сярод нас ударнікі. Вось, напрыклад, герой першай пяцігодкі рамшчык т. **Гладышаў** сыстэматычна перавыконвае свае заданьні. Але акружыць ударніка штодзённымі клопатамі, павагай—у нас гэтага няма.

Адным словам, шмат недахопаў выявілі мы сёньня на сваім цэхавым сходзе, які прысьвечан абмеркаваньню адозвы ўдарнікаў фабрыкі «Дзьвіна».

Мы цалкам падтрымліваем гэту каштоўнейшую ініцыятыву і лічым, што пераклічка паслужыць для нас магутным сродкам, каб поўнасьцю пакрыць запазычанасьць перад пралетарскай дзяржавай у галіне выкананьня прамфінпляну. Поўнасьцю загрузіць рабочы дзень—наш першачарговы абавязак. Варштат павінен бязупынна працаваць усе 420 мінут у зьмену.

Саматасы, канвэеры, элеватары не павінны спыняць свайго руху ні на адну сэкунду. Ні аднаго халастога ўзмаху пілы! Бярвеньні павінны ісьці лоб у лоб, каб непатрэбна было чакаць, пакуль у раму наступіць наступнае.

Мы патрабуем ад кіраўніцтва камбінату забясьпечыць сваячасовую вываўку прадукцыі нашага цэху, бо інакш гэта зрывае работу. Са свайго боку мы абавязуемся дапамагчы паскорыць будаўніцтва вузкакалейкі.

Таксама павінна быць выканана наша патрабаваньне цэхаўдзелам камбінату аб пастаўцы наждачных каменьняў. Нельга далей цярпець такога становішча, калі пілы з-за адсутнасьці каменьняў ня вострацца і псуюць матар'ял.

Абавязак нашага камбінату, як перадавога прадпрыемства сацыялістычнай індустрыі БССР, сустрэць рэвалюцыйнае сьвята поўным выкананьнем прамфінпляну як па колькасных, так і асабліва па якасных паказальніках. Для гэтага мы бярэм на сябе наступныя абавязкі. Норму расьпілоўкі ў ліку 751 кбм. выканаць, як мінімум, брак зьвесьці да нуля. Аднача сова праверыць работу гаспадарчаразрахунковых брыгад. Узьняць вышэй сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Ганаровае імя ўдарніка павінна заставацца за тымі рабочымі, якія сапраўды гераічна змагаюцца за выкананьне прамфінпляну.

Уводзім грамадзкі кантроль за работай аддзелу спабжэньня з тым, каб не дапускаць перабояў у забесьпячэньні цэху піламі, каменьнямі і інш. неабходнымі часткамі. Спэцыяльная брыгада вядзе нагляд за работай базы сырцу. Але галоўны наш абавязак—з гонарам выканаць вытворчую праграму: расьпілаваць 137.000 кбм. лесаматар'ялаў, у тым ліку 45.665 кбм. на экспарт, даць гэту прадукцыю лепшай якасьці. Гэтага мы можам і павінны дабіцца! Баявая праграма для нас—пастанова ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасьці.

Лепшыя ўдарнікі лесапільнага цэху Бабруйскага камбінату т. т. ВЫСОЦКІ, КАЗАКЕВІЧ, ДРАГУНОЎ, ГІЗУН, ЧЭЧЫК, КАЦНЭЛЬСОН, ЗЛОСКІН, ЛАПАК, МАКУМОВІЧ, ГЛАДЫШАЎ.

Вялікія „успехі" газэты „За пралетарскую навуку"

Пастановай СНК БССР аб зьменах і спрашчэньні беларускага правапісу зусім сваячасова пастаўлена пытаньне аб выгнаньні з беларускай мовы, з яе граматыкі, нацдэмаўскага сьмецьця, уплываў вялікадзяржаўнікаў, палёнізатараў і г. д.

З вялікай цікавасьцю мы чакалі першай газэты, надрукаванай паводле новага правапісу. І вось, нарэшце, перад намі «піянэр», шматтыражка **«За пралетарскую навуку»**, № 14 (31)—орган парткалектыву, прэзыдыуму і мясцкому Беларускай акадэміі навук.

Каму-каму, а ёй — **акадэмічнай** шматтыражцы—бязумоўна патрэбна ўзорнае ажыцьцяўленьне на сваіх старонках пастановы СНК!

Але... поўнае расчараваньне. У газэце—поўная дэзарганізацыя чытача ў пытаньнях новага правапісу! У адным месцы, напрыклад, чытаем **«ня ведаюць»**, у другім **«не ведаюць»**, і так суадпаведна: «навучальнага году»—«1933 **года**», «**комсамолу**» — «**камсамольцам**», «інстытуту»—інстытута».

Рэдакцыя шматтыражкі, «каб не памыліцца», адно і тое-ж слова друкуе ў трох варыянтах: 1) чацьвярыкова, 2) Чацверыкова, 3) Чацьвярыкова (!) Імкнучыся хутчэй ажыцьцявіць пастанову, рэдакцыя пускае словы ў такой арфаграфіі, што сэнс іх робіцца вядомым хіба толькі аднаму рэдактару—**Я. Багданскаму.**

Чаго варты, напрыклад, такія недакладнасьці і проста скажэньні: «пропуско**ў**»--«пропуска**ў**», «**неў**важлівых», «**неў**дарнікаў», «молёдзь»; паводле новага-ж правапісу павінна быць: «**ня**ўважлівых», «**ня**ўдарнікаў», «моладзь», «інстытута»... «Не» і «без», калі яны стаяць асобна, трэба заўсёды пісаць праз «е»,—таварышы з рэдакцыі «за П. Н.».

Нарэшце, рэдакцыя дайшла да таго, што піша: «**вялікіх ўспехаў**» замест «посьпехаў», «ёсць, замест «**ёсьць**»; «ўне поля дзейнасьці» і інш.

Замест мабілізацыі ўвагі чытача на хутчэйшае ауладаньне новым правапісам, на барацьбу за граматнасьць, за чыстату мовы рэдакцыя **«За пралетарскую навуку»** толькі дэзарыентуе яго. І ў гэтым напрамку ў яе сапраўды «ёсць» многа вялікіх «ўспехаў»!

Ю. Л.
М. Б

САЦСПАБОРНІЦТВА З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦЮ НА ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ФІНПЛЯНУ

ПЛЯН МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 72 ПРОЦ.

УСЕ СІЛЫ НА БАРАЦЬБУ ЗА ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ФІНАНСАВЫХ ЗАДАНЬНЯЎ ДА 20 ВЕРАСЬНЯ

ЯШЧЭ АБ АШЧАДНЫХ КАСАХ

Першае паўгодзьдзе гэтага году ашчадныя касы Беларусі закончылі з вялікім недавыкананьнем пляну мабілізацыі сродкаў па асноўнаму віду сваёй работы—укладах. Два месяцы 3-га кварталу (кварталу, які па сутнасьці рашае гадавы фінансавы плян і зьяўляецца самым спрыяючым для прыцягненьня ўкладаў) не далі належнага пералому ў рабоце. На 10-е верасьня квартальнае заданьне па ўкладах па БССР выканана ўсяго на 9,8 проц. Больш таго, 34 раёны замест росту ўкладаў далі адліў на 736,7 тысяч рублёў.

Няма і ня можа быць ніякіх аб'ектыўных прычын для апраўданьня такога агідна-недапушчальнага становішча. Корань зла хаваецца імена ў тым, што сама фінансавая сыстэма, ня гледзячы на цэлы рад канкрэтных дырэктыў і ўказаньняў з боку Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б і СНК БССР, не перабудавала работы і не дабілася ўкараненьня ашчадных кас у быт працоўных гораду, у быт калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў вёскі.

У свой час на старонках «Зьвязды» былі паказаны агідна недапушчальныя факты шкодніцкай работы і злачыннага раскрадваньня дзяржаўных сродкаў у сіроцінскай і аршанскай ашчадкасах. У гэтых касах кучка агалцелых злодзеяў самым нахабным чынам абкрадвалі дзяржаву.

Ворша і Сіроціна, аказваецца, не выключэньне. Падобныя факты наглядаюцца і па іншых ашчадкасах. Кантралёр мсьціслаўскай ашчадкасы **Воўк** па працягу доўгага часу займаўся сыстэматычнай кражай з кліенцкага партфэлю выйгрышных аблігацый.

Галоўны бухгальтар **гомельскай гарашчадкасы Баскін** па працягу доўгага часу аплачваў сам сабе ўсякую работу, якую ён абавязан выконваць бясплатна па займамай пасадзе. Гэты воўк у авечай скуры атрымаў за складаньне гадавой справаздачы звыш заработы 325 руб., за падгонку бягучай справаздачнасьці—200 руб., за складаньне месячнай справаздачнасьці за люты і сакавік—150 руб. за наладжваньне ўліку па дзяржпазыках—100 руб. і без усякага повада 350 руб. Апрача таго, набраў розных авансаў на 800 руб. А ў цэлым па гомельскай касе растрачана 13 з паловай тысяч руб.

У глускай касе растрачана 7.000 руб. Кантралёр шрыгімнай касы пры саўгасе **«Хаямцы» Балвановіч** узяў 2.588 руб. наяўных грошай і 3.210 руб. аблігацый дзяржпазык, зачыніў касу і паехаў у Бабруйск.

Касір **сеньненскай** райашчадкасы **Шафранскі** забраў 1.937 руб. наяўных грошай, 1.100 руб. аблігацый рыначных пазык, і больш 2,000 тіражных аблігацый і пайшоў кудысьці ў іншую касу. (?!)

На што ўжо прыводзяць раённыя касы, калі ў менскай касе № 16 на 1 ліпеня растраты складаюць 15.328 руб. У першае аддзяленьне быў прыняты на работу нейкі **Гарабурда.** Гэтаму Гарабурду даручылі з касы атрымаць 2 000 руб. Ён атрымаў грошы і нясе іх у касу да сёньняшняга дня.

Намесьнік галоўнага бухгальтэра **магілёўскай** райашчадкасы **Кавалеўскі** і кантралёр **Лупалаўскай** ашчадкасы **Казачкоў** сыстэматычна выкрадалі з кліенцкага партфэлю выйгрышныя аблігацыі і атрымлівалі на іх выйгрышы. Яны па падложных дакумантах атрымлівалі з касы наяўныя грошы, спэкулявалі вэлёабавязацельствамі.

Зусім нярэдкі выпадкі, калі работнікі ашчадкас, кантралёры падрабляюць нумары аблігацый і па іх атрымліваюць выйгрышы (**Чавусы, Ветка, Гарадок**).

Гэта ўсё каштуе дзяржаве сотні тысяч руб. і кладзецца на дзяржаўны бюджэт, паколькі ЗА СРОДКІ АШЧАДНЫХ КАС НЕПАСРЭДНА АДКАЗВАЕ ДЗЯРЖАВА.

Барацьбе з растратамі ў ашчадкасах павінна быць надана самая сур'ёзная ўвага з боку партыйных, савецкіх, прафсаюзных арганізацый і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Неабходна зараз-жа Наркамфіну сумесна з пракуратурай і органамі ЦКК НК РСІ ўзяцца за карэнную перабудову ашчадных кас, з тым, каб іх ператварыць у сапраўдныя савецкія ўстановы, якія-б здолелі выконваць ускладзеныя на іх абавязкі ў справе мабілізацыі сродкаў шырокіх працоўных мас на справу сацыялістычнага будаўніцтва.

М. Р—ч.

Кандыдаты на ўсесаюзную чырвоную дошку ўдарнікаў фінфронту

ЗАСЛАЎСКІ РАЁН — выканаў плян мабілізацыі сродкаў на 105,6 проц. і даходы з аграмаджанага сэктару на 110,8 проц. Сакратар РК — БЕЛАШЭЎСКІ, старшыня РВК — ПАШВЕНЧУК, заг. райфа — ЛУФЕРАЎ.

СМАЛЯВІЦКІ РАЁН — 104,3 і 129,3 проц. Сакратар РК — КУДМАН, старшыня РВК — КОЗІНЦАЎ, заг. райфа — РУБЕНЧЫК.

СЛУЦКІ РАЁН — 100,5 і 86,6 проц. Сакратар РК — КРАЦЭР, старшыня РВК — КНЯЗЕЎ, заг. райфа — ЗАЛЕСКІ.

АСЬВЕЙСКІ РАЁН — 105,1 і 106,7 проц. Сакратар РК — СЬЦЕФАНОВІЧ, старшыня РВК — ШКАДАРЭВІЧ, заг. райфа — КУЛІКАЎ.

Заносяцца дадаткова:

СТАРОБІНСКІ РАЁН — 105,7 і 66,6 проц. Сакратар РК — ВАРОНЧАНКА, старшыня РВК — ГРЫШЧАНКОЎ, заг. райфа — ШЫРАБО.

РАГАЧОЎСКІ РАЁН — 101,4 і 30,4 проц. Сакратар РК — ГЕЎРАСЕЎ, старшыня РВК — ЗЯЛЁНКА, заг. райфа — ВАЛІЦКІ.

ЛЮБАНЬСКІ РАЁН — 101,6 і 72,0 проц. Сакратар РК — КАВАЛЁЎ, старшыня РВК — КЛІМАЎ, заг. райфа — СЬЦЕФАНАЎ.

ЕЛЬСКІ РАЁН — 107,6 і 80,1 проц. Сакратар РК — АЎЛАСЕНКА, старшыня РВК — ЗЕНЬЧЫК, заг. райфа — ДОЎГІ.

БЯГОМЛЬСКІ РАЁН — 103,5 і 102,1 проц. Сакратар РК — АНІСАЎ, старшыня РВК — ШЭМПЕЛЬ, заг. райфа — ВЯЧЭРСКІ.

ЧЭРВЕНЬСКІ РАЁН — 100,8 і 76,4 проц. Сакратар РК — ВАСІЛЬЕВА, старшыня РВК — БУШМАН, заг. райфа — ДАБРАВОЛЬСКІ.

Зьнімаюцца з кандыдатаў на чырвоную дошку

ЧАВУСКІ РАЁН — за апартуністычную бязьдзейнасьць у справе выяўленьня і абкладаньня кулацкіх гаспадарак. Сакратар РК — БЯГУН, старшыня РВК — АДАМЧУК, заг. райфа — СКАРАХОД.

ПУХАВІЦКІ РАЁН — за поўнае ігнараваньне выкананьня добраахвотных плацяжоў (пазыка і ўклады ў ашчадкасы) у кандыдаты на чырвоную дошку не заносяцца, хоць агульны квартальны плян па мабілізацыі сродкаў і выканан на 103,2 проц. Сакратар РК — СКАРАХОД, старшыня РВК — СТУПАКОЎ, заг. райфа — КУЧЫНСКІ.

ЧОРНАЯ ДОШКА

зрыўшчыкаў фінпляну

ЦЕРАХАЎСКІ РАЁН, які на 10 жніўня выканаў плян мабілізацыі сродкаў на 58,6 проц., даходы з аграмаджанага сэктару — 42,7 проц. Сакратар РК — РАМАНЕНКА, старшыня РВК — ДУПАНАЎ, загадчык райфа — КАРНЕЙЧЫК.

ЛОЕЎСКІ РАЁН адпаведна: 53,2 і 54,0 проц. Сакратар РК — ТРУС, старшыня РВК — АСМАЛОЎСКІ, заг. райфа — ІВАНОЎ.

КАРМЯНСКІ РАЁН — 27,7 і 38,0 проц. Сакратар РК — САЛАДУХІН, старшыня РВК — КІН, заг. райфа — ГОЛУБЕЎ.

БЕШАНКОВІЦКІ РАЁН — 63,0 і 30,2 проц. Сакратар РК — КАЖДАН, старшыня РВК — ШАХ, заг. райфа — ШАБОЛТАС.

ПРАПОЙСКІ РАЁН — 57,7 і 62,9 проц. Сакратар РК — ПАПОВІЧ, старшыня РВК — ЦЭНЦЫПЕР, заг. райфа — ЖЫЦІН.

УВАРАВІЦКІ РАЁН — 37,1 і 39,0 проц. Сакратар РК — ФРЫДМАН, старшыня РВК — КАРАЛЕНКА, заг. райфа — БУРАКОЎ.

СУРАСКІ РАЁН — 45,8 і 43,6 проц. Сакратар РК — АЎДЗЕЙЧЫКАЎ, старшыня РВК — РУСАН, заг. райфа — МАНЮК.

Заносяцца дадаткова:

СЕНЬНЕНСКІ РАЁН — выканаў плян мабілізацыі сродкаў на 43,4 проц. і даходы з аграмаджанага сэктару на 100,2 проц. Сакратар РК — ЛЕНЦНЕР, заг. райфа — ШАМЕЦЬКА.

ЖЛОБІНСКІ РАЁН — 49,2 і 44,7 проц. Сакратар РК — ПЛЕШАКОЎ, старшыня РВК — ТАМАШЭЎСКІ.

ДУБРОВЕНСКІ РАЁН — 48,9 і 90,7 проц. Сакратар РК — КАЦМАН, старшыня РВК — СЕМАШКА, заг. райфа — ФІЛІПАЎ.

КЛІЧАЎСКІ РАЁН — 45,8 і 72,0 проц. Сакратар РК — ЯКАЎЛЕЎ, старшыня РВК — ГРЫБАЕДАЎ, заг. райфа — ЛЕАКУМОВІЧ.

Зьнімаюцца з чорнай дошкі

БЫХАЎСКІ РАЁН, які выканаў квартальны плян на 73,1 проц. і па даходах з аграмаджанага сэктару на 53,4 проц. Сакратар РК — РЭЗЬНІКАЎ, старшыня РВК — ГРЫНЬКЕВІЧ, заг. райфа — АНТАНІШАН.

ЧЭРЫКАЎСКІ РАЁН — 85,8 і 75,7 проц. Сакратар РК — КАЦ, старшыня РВК — РАТАЙКА, заг. райфа — ТОКІН.

Золата на Кубані

На Кубані (Карачаеўская вобласьць) дасьледчай групай Саюззолата знойдзены залатыя россыпы на рацэ Кубань. Па якасьці гэтае вынайдзенае золата блізка да поўнацэннага АЎДАНСКАГА.

НА ЗДЫМКУ: прамыўка золатаноснага пяску на р. Кубань.

І. М. Фэльдман

Умацаваць савецкі гандаль

Рост калгасаў і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне іх у спалучэньні з багатым ураджаем, які зьбіраецца ў бягучым годзе, стварылі ўсе неабходныя прадпасылкі да таго, каб лёзунг правадыра партыі тав. Сталіна—«зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а калгасьнікаў заможнымі» — атрымаў сваё практычнае ажыцьцяўленьне ва многіх калгасах ужо сёлета.

У горадзе ўздым з году ў год культурнага і матар'яльнага становішча шырокіх мас працоўных стаў ужо фактам, характарызуючым агульны плыхільны рост дабрабыту нашай краіны.

У гэтых умовах тавараабарот набывае выключна важнае значэньне. Здавальненьне вялізарнага попыту, прад'яўляемага рабочымі, калгасьнікамі і працоўнымі аднаасобнікамі, вымагае карэннай перабудовы ўсяго тавараправодзячага апарату.

Умовы гандлю ў бягучым годзе рэзка зьмяніліся, спажывец стаў больш патрабоўны да якасьці і асартымэнту тавараў. Неразуменьне з боку нашай гандлюючай сыстэмы гэтых асноўных зьявішчаў, пагарда да запытаньняў і густаў спажыўца, высокамерна-бюракратычныя адносіны да спажыўца ў галіне здавальненьня яго патрабаваньняў да якасьці і асартымэнту тавараў, канцылярска-бюракратычныя мэтады кіраўніцтва гандлем— усё гэта прывяло да таго, што цэлы рад зьвеньняў гандлюючай сеткі апынуўся перад фактам затаварваньня і замарожваньня вялізарных мас няходкіх і нізкаякасных тавараў.

Дрэнная работа нашых гандлюючых арганізацый, цяжкі фінансавы стан іх зьяўляецца буйнейшым тормазам у справе разьвіцьця савецкага гандлю.

Уводзімы з 1 кастрычніка бягучага году новы парадак крэдытаваньня тавараабароту павінен зьявіцца магутным стымулам для паляпшэньня фінансавай базы гандлюючых арганізацый.

Далейшае разгортваньне савецкага гандлю немагчыма бяз моцнай фінансавай гаспадаркі тавараправодзячай сыстэмы, без пастаяннага прытоку накапленьняў уласных зваротных сродкаў.

Гнуткія мэтады крэдытаваньня тавараабароту, максымальнае прыстасаваньне банкаўскага крэдыту да здавальненьня ўзрастаючага тавараабароту павінны спалучацца з рашучым паляпшэньнем кантролю рублём за дзейнасьцю тавараправодзячых арганізацый.

У гэтым асноўны сэнс закону Саўнаркому Саюзу ад 16 жніўня 1933 г. аб парадку крэдытаваньня тавараабароту.

Было-б абсалютна няправільна разглядаць новы парадак крэдытаваньня тавараабароту, як прыватную справу банка і гандлюючых арганізацый.

Як відаць са сказанага вышэй, новы парадак крэдытаваньня тавараабароту мае вялізарнае прынцыповае значэньне і выходзіць далёка за межы ведамственных узаемаадносін паміж Дзяржбанкам і тавараправодзячай сыстэмай.

У адпаведнасьці з новым законам, крэдыт па тавараабароту можа быць прадстаўлен тым арганізацыям, якія бязумоўна рэнтабельны, у якіх гандаль аддзелены ад іншай негандлёвай дзейнасьці, у якіх наладжан улік і ёсьць поўны мінімум уласных зваротных сродкаў.

Калі супаставіць гэтыя зусім абавязковыя ўмовы, пры якіх магчыма крэдытаваньне гандлюючай арганізацыі, з фактычным становішчам многіх зьвеньняў тавараправодзячай сыстэмы, то ня цяжка бачыць, якую вялізарную падрыхтоўчую работу трэба будзе прарабіць у кароткі пэрыяд, які застаўся да 1-га кастрычніка г. г.

Падрыхтоўчая работа банку і ў першую чаргу гандлюючых арганізацый павінна быць накіравана на выяўленьне наяўных уласных зваротных сродкаў, на давядзеньне іх да неабходнага мінімуму, які дае магчымасьць данай арганізацыі карыстацца банкаўскім крэдытам, на максымальнае скарачэньне накладных выдаткаў, на перабудову ўсёй работы ў такім напрамку, каб далейшая рэнтабельная работа гандлюючай арганізацыі была-б поўнасьцю забясьпечана. Толькі пры гэтых умовах і магчыма нармальнае банкаўскае крэдытаваньне.

Разгортваньне тавараабароту патрабуе шырокага ахопу новым парадкам крэдытаваньня гандлёвых арганізацый.

Тут усё залежыць ад саміх гандлюючых арганізацый, ад іх уменьня хутка перабудаваць сваю работу, ад іх актыўнасьці ў рэзкім зьніжэньні выдаткаў звароту, у стварэньні ўсіх неабходных умоў і магчымасьцяй для нармальных накапленьняў. Банк абавязан з усёй строгасьцю падыйсьці да ацэнкі кожнай гандлюючай арганізацыі, да ацэнкі таго, наколькі яна падыходзіць да ўмоў прадастаўленьня ёй крэдыту. Было-б злачынна з пункту погляду ўстойлівасьці савецкага рубля, захаванасьці банкаўскіх сродкаў і інтарэсаў самога тавараабароту прадастаўляць крэдыты ягуна «безнадзейным» гандлюючым зьвеньням.

Але ў той-жа час трэба разумець, што ня ў інтарэсах тавараабароту мэханічна адсякаць дрэнна працуючую гандлёвую арганізацыю. Трэба з асаблівай дакладнасьцю вывучаць кожную такую арганізацыю, вышукваючы ўсякія магчымасьці, якія здольны былі-б падняць яе да ўзроўню патрабаваньняў, пры якіх магчыма банкаўскае крэдытаваньне.

І з гэтага пункту погляду было-б глыбока памылковым для Дзяржбанку займаць у адносінах да дрэнна працуючых арганізацый пасыўную пазыцыю, замест сапраўднай дапамогі ім.

Вышэй мы сказалі, што адна з асноўных умоў крэдытаваньня гандлюючай арганізацыі ў банку—гэта мінімум (10 проц.) удзелу ўласных зваротных сродкаў у адносінах да ўстанаўліваемага нарматыву. Астатнія сродкі напаўняюцца банкам у парадку падтаварнага крэдыту на тэрмін да дванаццаці (а ў паасобных выключных выпадках да пятнаццаці) месяцаў.

Гэта—**першы від крэдыту,** устанаўліваемага законам ад 16 жніўня.

Фінансавая база гандлюючай сыстэмы дзякуючы гэтаму крэдыту атрымлівае вялікае падмацаваньне, якое дае магчымасьць поўнасьцю пакрыць устаноўлены для данай арганізацыі нарматыў.

Найбольш важны бок гэтага крэдыту—гэта вялізарны стымул да стварэньня ў гандлюючай арганізацыі нармальных накапленьняў. Імена дзякуючы гэтаму віду крэдыту банкаўскі кантроль над ходам накапленьняў становіцца найбольш рэальным і дзейсным. На самой справе, крэдыт гэты адпускаецца на тэрмін да дванаццаці месяцаў, пагашэньне яго ідзе за кошт накапленьняў, устаноўленых па пляну. Варта толькі гандлёвай арганізацыі не аплаціць у належны тэрмін частку гэтага крэдыту, як прарыў у ходзе накапленьняў як-бы аўтаматычна выкрываецца. Неплацеж можа здарыцца або па прычыне непаступленьня наявых узносаў, або з прычыны высокіх накладных выдаткаў, растрат і інш. прычын. Гэта неадкладна выяўляецца на факце непаступленьня ў банк чарговага плацяжу. Сыгнал аб прарыве данай гандлюючай арганізацыі ў наяўнасьці, і, зразумела, узьнікае неабходнасьць у прыняцьці тэрміновых мер для аздараўленьня становішча.

Але патрэбнасьці ў зваротных сродках не абмяжоўваюцца ўстаноўленым нарматывам. Нарматыў—гэта мінімальная патрэбнасьць ва ўласных зваротных сродках, часткова напаўняемая часовай ссудай банку, між тым, як узрастаючы тавараабарот ня можа пакрывацца ўласнымі сродкамі, вышукаючымі з гэтага нарматыву. Для аплаты завезеных тавараў звыш устаноўленага нарматыву, для выкананьня ўсяго пляну тавараабароту, банк адкрывае бягучы крэдыт—**другі від крэдыту.**

Асноўная мэта гэтага віду крэдыту—садзейнічаць паскарэньню зваротнасьці тавару. Крэдыт гэты прадастаўляецца на аплату рахункаў на тэрмін плянавай зваротнасьці данай партыі тавараў. Неплацеж у тэрмін па данаму крэдыту сыгналізуе, як і ў першым выпадку, аб наяўнасьці прарыву ў дзейнасьці гандлюючай арганізацыі, хоць і некалькі іншага характару. Тут прарыў выцякае ўжо з замаруджанага звароту тавараў, магчымага затаварваньня, зьвязаных з цэлым радам прычын (нізкая якасьць тавараў, нягодны асартымэнт, няўменьне правільна манэўраваць таварнымі масамі і, нарэшце, перакачка сродкаў з гандлю ў негандлёвую дзейнасьць).

Як мы ўжо сказалі, пераход на новы парадак крэдытаваньня тавараабароту зьвязан з вялізарнай падрыхтоўчай работай. Ні ў якім выпадку ня могуць стаяць у баку ад гэтай вялікай справы мясцовыя партыйныя, савецкія, прафэсыянальныя арганізацыі. Дапамога з боку апошніх павінна быць самая актыўная і істотная. Неабходна на мясцох штодзённа правяраць, як ідзе гэта падрыхтоўчая работа па лініі гандлюючай сыстэмы, і банку. Трэба асабліва зьвярнуць увагу на стварэньне ўсіх неабходных умоў для таго, каб кожную гандлёвую арганізацыю зрабіць здольнай для нармальнага крэдытаваньня ў банку. Калі ўсе магчымыя крыніцы для стварэньня мінімальнай часткі ўласных сродкаў невыстарчальны, то ў гэтых выключных выпадках мясцовы бюджэт абавязан прыйсьці на дапамогу гандлюючай арганізацыі ў справе стварэньня гэтага мінімуму. У гэтым непасрэдна зацікаўлены раённыя арганізацыі, бо забесьпячэньне нармальнага тавараабароту зьяўляецца простым абавязкам іх.

Выкананьне пляну тавараабароту ўжо ў 4-м квартале будзе ў значнай меры абумоўлівацца тым, наколькі пасьпяхова будзе ажыцьцёўлен новы закон аб крэдытаваньні гандлюючых арганізацый, наколькі выразна да яго падрыхтуецца банк і ў асаблівасьці гандлюючая сыстэма. Усё гэта ў значнай меры будзе таксама залежыць ад таго, наколькі раённыя партыйныя, савецкія і інш. арганізацыі ўсьвядомяць важнасьць гэтага мерапрыемства і актыўна дапамогуць яго правядзеньню.

Імена таму мы маем права лічыць, што адказнасьць за ажыцьцяўленьне гэтага закону ўскладаецца ня толькі на кіраўнікоў гандлюючых арганізацый і банку, але і ў такой-жа ступені на раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі.

Толькі пры гэтых умовах можна быць упэўненым у тым, што пастанова партыі і ўраду аб новай сыстэме крэдытаваньня тавараабароту будзе пасьпяхова і ў тэрмін ажыцьцёўлена.

У Шклове, Чачэрску і Бабруйску злачынна адносяцца да прыёмкі і аховы дзяржаўнага збожжа

ПРАВІЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ ПРЫЁМКІ і ЗЬБЕРАЖЭНЬНЯ ПРАДУКЦЫІ ДАВЕСЬЦІ ДА КАНЦА БАРАЦЬБУ СА СТРАТАМІ ЎРАДЖАЮ

ЗЬБЕРАГЧЫ ЗБОЖЖА АД СТРАТ І РАСКРАДВАНЬНЯЎ

У адрозьненьне ад мінулых год вялізарныя масы збожжа пашлі ў гэтым годзе на ссыпныя пункты з першых жа дзён уборкі і абмалоту. Мы маем ня мала калгасаў, вёсак і сельсаветаў, якія ўжо завяршылі выкананьне гадавога пляну.

Аб гэтым сьведчыць той факт, што БССР ужо выканала 46,4 проц. гадавога пляну паставак збожжа. Калгасы здалі 138,2 проц. — жнівеньска-верасьнёўскага заданьня.

Аднак аналіз становішча збожжапаставак па паасобных вучастках паказвае на рад сур'ёзных недахопаў у гэтай галіне.

Перш за ўсё кідаецца ў вочы зусім нездавальняючая здача збожжа кулацкімі гаспадаркамі — 6,3 проц. двухмесячнага пляну. Кулацкі сабатаж цьвёрдых паставак у радзе месц ня зломлены, дзе-ні-дзе праяўляюцца гніла-лібэральныя адносіны да манэўраў клясавага ворага.

Ня гледзячы на рад дырэктыў партыі і ўраду, САЎГАСЫ зацягваюць здачу дзяржаўнай прадукцыі. План паставак саўгасамі і каапгасамі выкананы на 37,7 проц. Гэта лічба відавочна сьведчыць, што лічна далёка не пераможаны буржуазныя тэндэнцыі. Дырэктары некаторых саўгасаў шляхам розных жульніцкіх махінацый імкнуцца ўтаіць прадукцыю ад дзяржавы (саўгасы «Граніт» і «Каменка», Крупскага раёну).

Возьмем далей НАТУРАПЛАТУ МТС. Гадавы плян здачы натураплаты выкананы на 15,9 проц., жнівеньска-верасьнёўскі плян на 22,9 проц.

Некаторыя раёны недаацэньваюць значэньня натураплаты, яны ўпускаюць з віду, што плян здачы збожжа можа лічыцца выкананым толькі тады, калі поўнасьцю ўнесена натураплата. У пагоні за процэнтамі, некаторыя калгасы дапускаюць злачынныя махінацыі — залічаюць натураплату ў зводку збожжапаставак, адкладваюць унясеньне натураплаты да поўнага выкананьня пляну паставак (Полацкі, Гомельскі раёны). НЕДААЦЭНКА ЗБОРУ НАТУРАПЛАТЫ ПА СУТНАСЬЦІ АЗНАЧАЕ НЕДААЦЭНКУ ЗАДАЧ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА ЎМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ. За фактамі ігнараваньня натураплаты, як адзначыла «Праўда», хаваецца кулацкае супраціўленьне росту ўплыву МТС на калгасную вытворчасьць. Адначасовае і поўнае выкананьне пляноў цьвёрдых паставак і натураплаты — вось галоўная задача.

Выкананьне абавязкаў перад дзяржавай ні ў якім разе не абмяжоўваецца здачай збожжа на пункты. Рашаючым зьвяном зьяўляецца тут АРГАНІЗАЦЫЯ АХОВЫ І ЗЬБЕРАЖЭНЬНЯ ЗБОЖЖА. Між тым, як сьведчаць матар'ялы, што друкуюцца сёньня ў «Зьвяздзе», гэта важнейшая справа ў радзе месц злачынна ігнаруецца. Няма бальшавіцкіх клопатаў і законнай трывогі за зьберажэньне кожнага зерня сабранага ўраджаю. Безадказныя адносіны да прыёмкі і хаваньня прадукцыі, да абслугоўваньня здатчыка трэба кваліфікаваць, як простае пасобніцтва клясаваму ворагу ў яго імкненьні зьнішчыць ураджай.

Барацьба са стратамі зерня толькі тады будзе даведзена да канца, калі партыйныя і савецкія арганізацыі на месцох сур'ёзна, па-баявому возьмуцца за арганізацыю прыёмкі прадукцыі і аховы збожжа

ХОД ЗБОЖЖАПАСТАВАК ПА БССР

(У процантах да гадавога пляну на 10-е верасьня)

Агульнае выкананьне пляну	Калгасы	Аднаасобнікі
46,4	61,4	42,1
Саўгасы і каапгасы	**Натураплата МТС**	**Кулацкія гаспадаркі**
37,7	15,9	6,3

Вораг арудуе на прыёмцы

ШКЛОЎ. У пагоні за ўрачыстымі рапартамі многія старшыні сельсаветаў, сакратары партячэек і старшыні калгасаў уступілі на шлях злачыннага ашуканства дзяржавы. Старшыня Чарнаўскага сельсавету **Семчонка** і сакратар партячэйкі **Адзінец** дазволілі калгасам здаваць вільготнае, дрэннае збожжа. Калгас «Орка» гэтага сельсавету даставіў на пункт каля трох тон вільготнага збожжа. Камуна імя Молатава прывезла прадукцыю, вільготнасьцю ў 22 проц.

Старшыня Ардацкага сельсавету **Аляксееў** у пагоні за процантамі санкцыянуе махінацыі клясава-варожых элемэнтаў. Старшыня калгасу «Чырвоныя рэчкі» **Шляхтаў** прымусіў калгасьнікаў везьці на склад за 30 кілёмэтраў непрасушаны і засьмечаны ячмень. «Для дзяржавы добра будзе», —сказаў гэты кулацкі агент. Калгас імя Варашылава Уланаўскага сельсавету даставіў на склад 4 мяшкі жыта, з якіх два былі з добрым збожжам, а ў астатніх зьверху ляжала сухое жыта, а зьнізу вільготнае.

Гэта рабілася з блаславеньня ўпаўнаважанага РК і РВК тав. **Шчарбакова.** Ён паслаў загадчыку складу ліст, у якім патрабаваў прыняць вільготнае збожжа, бо іншага ў нас няма».

Збожжапастаўкі па Шклоўскім раёне наогул не арганізаваны па-бальшавіцку. Кантора Загатзбожжа не склала цьвёрдых пляноў вывазкі прадукцыі ў адпаведнасьці з тэрмінамі паставак, каб не ствараць затораў. У выніку бесплянавасьці ў радзе сельсаветаў наглядаюцца факты затрымліваньня збожжа, каб здаць яго вялікімі абозамі і выключна па нядзелях, замест таго, каб арганізаваць пастаўкі зараз-жа з-пад малатарні. Таму па нядзелях ствараюцца заторы на прыёмачных пунктах, а ў іншыя дні загатоўчы апарат адпачывае.

Загатовіць збожжа гэта яшчэ далёка ня ўсё. Трэба арганізаваць пільную ахову прадукцыі і захаваць яе да апошняга зерня. Гэтага ня хоча зразумець кіраўнік Загатзбожжа тав. **Піраціцкі.** Рэйд брыгад друку паказаў, што ахова складаў—у заняпадзе. Праверачныя брыгады пралязалі ў склад праз адкрытыя вокны. На складзе ў канцы горада адным штуршком рукі ўдалося адкрыць дзьверы. Вартаўнік складу на Базарнай плошчы **Аўсяньнікаў** спаў на дзяжурстве.

Зусім не арганізавана пажарная ахова, асабліва на гарадзкіх складах. Загадчык канторы **Піраціцкі** як быццам наўмысна набраў у склад вартаўнікоў калек, інвалідаў, фізычна хворых. Што дзіўнага ў тым, што на некаторых складах былі пакражы збожжа?

Камсамольскія ячэйкі ня прынялі ніякага ўдзелу ў арганізацыі аховы і кантролю за складамі.

Некалькі слоў пра абслугоўваньне здатчыкаў. Калгасьнікам і аднаасобнікам трэба ведаць некалькі складаў, каб здаць збожжа: у адным прымаюць жыта, у другім ячмень, у трэцім віку, у кожным неабходна атрымаць ярлык і пайсьці ў кантору Загатзбожжа каб канчаткова разьлічыцца. Там прыходзіцца прастаяць некалькі гадзін, пакуль кур'ер прынясе квітанцыі са складаў. Ёсьць факты, калі здатчыкаў пасылаюць з аднаго складу ў другі, а потым зноў назад.

Нават такой дробязі, як гатаваная вада, ня знойдзеш на прыёмачных пунктах. Нідзе ня ўбачыш газэт, лёзунгаў. Не праводзіцца культурна-масавая работа.

З такімі бяздушнымі, казённа-бюракратычнымі адносінамі да здатчыкаў трэба пакончыць як мага хутчэй.

Брыгада друку: **Міравы, Бычкоў, Рыбакоў, Паўловіч, Каласоўскі.**

За заслонай „дажджлівага надвор'я"

Перад намі рад карэспандэнцый з месц. З розных раёнаў БССР селькоры сыгналізуюць аб манэўрах кулацтва, накіраваных на зрыў уборкі, аб фактах гніеньня ўраджаю на палёх, аб прарослым жыце, аб пачарнеўшым ільне. Яны патрабуюць прыняцьця неадкладных мер, каб папярэдзіць вялікія страты.

Карэспандэнцыі гавораць аб тым, што за заслонай усякага рода «аб'ектыўных» прычын, спасыланьняў на дажджлівае надвор'е, у радзе калгасаў кулакі ціхай сапай разбураюць гаспадарку. Вораг выкарыстоўвае найменшае паслабленьне клясавай пільнасьці для вынішчэньня вынікаў упартай калгаснай працы.

Тав. **Падольскі** з Бешанковіцкага раёну ў сваім лісьце піша:

«У калгасе «Трыпліна» лён выцерабілен толькі на 63,5 проц., чарнее, гніе. У трэцяй брыгадзе калгасу 8 га не зьвязанага жыта прарасло, у тым-жа калгасе засталіся ня скошанымі 93 гэктары сена».

Дзе прычыны гэтай злачыннай безгаспадарчасьці? Хто вінаваты ў вялікіх стратах?

Аказваецца, старшыня калгасу **Валідовіч** — былы абшарнік, меўшы 50 га зямлі, 10 кароў, 8 коняй. Сям'я рахункавода Латышава і зараз мае аднаасобную гаспадарку і плаціць сёлета 250 руб. падатку. У калгасе шмат былых батракоў Валідовіча.

Ведаюць аб гэтым раённыя арганізацыі, але дагэтуль калгас яшчэ не ачышчаны ад кулацкіх элемэнтаў.

Селькор **«Калючы»** паведамляе з калгасу **«Ленінскі шлях»**, Крупскага раёну:

«У калгасе пагніло 500 пуд. сена. На сьцелішчы гніе ўвесь лён, ні адзін сноп яшчэ не абмалочан. Працоўная дысцыпліна — у заняпадзе. Старшыня калгасу РАМАНЬКОЎ адвёз збожжа ў Крупкі, напіўся п'яным і забыўся разьлічыцца на пункце, паслаў па квіткі аднаго калгасьніка, таксама п'янага, той вярнуўся раніцай і сказаў, што ноччу на яго нехта напаў і адабраў квіткі». Вось такія парадкі не ўсіх вучастках. Можна было ў сярэдзіне жніўня пачаць азімую сяўбу. Але старшыня калгасу загадаў чакаць «прачыстай». І чакаюць...

Пра шкодніцкія адносіны да працы ў калгасе «Н.-Міхайлава» (**Пухавіцкі** раён) паведамляе тав. **Багун.** У самую гарачую пару ўборкі ўраджаю праўленьне калгасу дало калгасьнікам выхадныя дні, і ў выніку 2 га пшаніцы, 20 га жыта і 7 га ячменю гніюць у полі.

Т. т. **Мароз, Жлобіч** і **Драчоў** з Глускага раёну пішуць, што ў калгасах «Майскі луч» і «Чырвоны лес» малацьба так дрэнна арганізавана, што 30 проц. жыта засталося ў саломе, пры чым аб паўторным абмалоце ніхто і ня думае.

У калгасе «Шлях сацыялізму» (Горацкі раён), як паведамляе т. **Ш. К.**, мае месца злачыннае раскрадваньне калгаснага збожжа:

«Кожны калгасьнік, які мае ўласны ток, вязе жыта да сябе, сушыць і сам малоціць, пры гэтым амаль што трэць абмалоту раскрадваецца. Ніякага ўліку, ніякага нагляду за малацьбой няма. Старшыня калгасу БЕЛІК патурае гэтаму злачынству».

У калгасе «Чырвоны Ўсход», таго-ж **Горацкага раёну**, як сыгналізуе тав. **Зайцаў:**

«500 пудоў насеннай пшаніцы сапрэла. Сырамолатая пшаніца ссыпана ў таку вышынёй у 1 мэтр. У выніку пшаніца пачарнела і страціла ўсхожасьць. Гэта злачынства засталося непакараным. Больш таго, загадчык Горацкага райза Алейнікаў абараняў старшыню гэтага калгасу БРАКЕРАВА».

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што барацьба за высокі ўраджай, за ахову грамадзкай маемасьці ва многіх калгасах зусім не вядзецца. Клясава-варожыя элемэнты, пралезшы ў праўленьні калгасаў, робяць сваю шкодніцкую справу і не атрымліваюць патрэбнага адпору.

Вышэй клясавую пільнасьць! Толькі канчаткова ачысьціўшы калгасы ад кулацкіх элемэнтаў, мы даб'емся пасьляховага завяршэньня ўборкі і збожжапаставак.

Слова--пракуратуры

ЧАЧЭРСК. Злачынна ахоўваецца збожжа на прыёмачным пункце «Гарапоўка». Фанэрная страха складу працякае. Ніхто не паклапаціўся аб тым, каб адрамантаваць страху. Вада працякае ў правы кут складу і псуе збожжа. Жыта так высока насыпана, што часта трапляе ў прахадны калідор, дзе яго топчуць нагамі. У некаторых мясцох, асабліва каля вагаў, шмат збожжа зьмешана з гразёю.

У трох засеках авёс, жыта і ячмень насыпаны да самай столі, шалёвачныя сьцены ад вялікага напору пагнуліся і могуць абваліцца кожную мінуту. У адным месцы шалёўка прарвалася і збожжа сыплецца на вуліцу, яго можа падабраць кожны, каму ня лень.

Загадчык пункту **Беспалаў** мала турбуецца аб ахове збожжа, ён зусім спакойна адносіцца да таго, што прадукцыя знаходзіцца пад пагрозай.

На базе замест вопытных работнікаў сядзяць вучні, якія блытаюць улік, насылаюць квітанцыі не на прыёмачныю. У бухгальтэрыі не хапае лічыльнікаў, лямп, канцылярскіх прыладаў.

Загадчык канторы Загатзбожжа **Брайнін** замест практычнай дапамогі прыязджае на гастролі і ніякіх канкрэтных мер ня прымае.

Характэрны факт, які малюе становішча з аховай складу. Некалькі дзён назад Беспалаў узяў мяшок са збожжам нібы на праверку і назад яго не зьвярнуў.

Каса пункту знаходзіцца на кватэры кулака. У часе дажджу здатчыкі стаяць на вуліцы, бо жонка кулака Ляшкевіч не пускае іх у хату. Акрамя таго, Ляшкевіч агітуе сялян супроць здачы збожжа.

Вартаўнікі складу Шалюта і Акінчыц некалькі разоў былі заўважаны сьпячымі на пасту, але адміністрацыя іх ня зьнімае з працы.

Да гэтага трэба дадаць злачынную блытаніну з прыёмкай прадукцыі. Збожжа прымаецца «на зуб». Былі выпадкі, што тое збожжа, якое ўчора ня прынялі з-за вільготнасьці, на заўтра прымалі безагаворачна. Вось, напрыклад, калгасы «Савецкая Беларусь», «Чырвоная Зорка» «1-га жніўня» прывезьлі жыта, яго ня прынялі, яны адвезьлі яго назад, праз дзень зноў выехалі з гэтым-жа збожжам, якое было прынята.

Справай Гарадоўскага ссыпнога пункту павінны заняцца сьледчыя органы.

Н. Зільбэрт.

Здача натураплаты зацягваецца

ПОЛАЦАК. Калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, унесьлі толькі 2 проц. натураплаты. МТС з вялікім спазьненьнем узяліся за гэту справу. Полацкая МТС давяла заданьне па натурплаце толькі 21 жніўня замест 15, Ветрынская МТС толькі 30 жніўня. Вакол гэтага пытаньня растлумачальна-масавая работа не праведзена. Калгасьнікі ня ведаюць, што плян натурплаты мае сілу закону, што ўнясеньне натураплаты зьяўляецца важнейшым зьвяном умацаваньня калгасаў.

У раёне наглядаюцца спробы залічыць натураплату ў зводку збожжазатовак. Шапілаўскі сельсавет (старшыня **Воднікаў**) выканаў плян па здачы збожжа на 60 проц., па натурплаце толькі на 6 проц.

Кулацка-заможныя элементы карыстаюцца адсутнасьцю масава-растлумачальнай работы і вядуць агітацыю супроць унясеньня натураплаты.

У раёне зусім забыліся аб пастанове партыі і ўраду, дзе гаворыцца, што «сваячасовая аплата паслуг МТС натурай безумоўна абавязкова, тых, хто ўхіляецца, трэба прыцягваць да адказнасьці». На пытаньне, чаму дрэнна паступае натураплата, нам. старшыні РВК тав. **Арачыч** адказаў: «Я вам нічога не магу сказаць, трэба запытаць МТС, я ведаю толькі адно, што камзаг загатаўляе, а Загатзбожжа прымае». Гэты адказ характарызуе адносіны раённых арганізацый да выкананьня пляну збору натураплаты

Л. Фрыд.

У БАБРУЙСКУ ІГНАРУЮЦЬ ЗДАТЧЫКА

БАБРУЙСК. Сотні фурманак стаяць у чарзе перад прыёмачнымі пунктамі г. Бабруйску. Пункты не падрыхтаваліся да бесьперабойнай прыёмкі прадукцыі. Работнікі канторы «Загатзбожжа» не паклапаціліся своечасова забясьпечыць пункты вагамі, сьвятлом, прыслаць касіраў і вагаўшчыкоў.

Нядаўна на складзе № 224 у Бярэзіне прымалі авёс. Мяшкі клалі на дзьве вагі ў той час, як дзьве вагі сталі ў запасе. На запытаньне, чаму прыёмка ідзе толькі на двух вагах, загадчык складу адказаў: «Бачыце, я яшчэ ўчора званіў у кантору Загатзбожжа, каб далі вагаўшчыкоў, але мне адмовілі». Нічога дзіўнага няма, што прыёмка зацягнулася, што каля пункту стварылася вялікая чарга.

Да гэтага трэба дадаць, што касір не адпавядае свайму прызначэньню. Ён на 30 мінут затрымлівае кожнага чалавека, і гэта яшчэ больш зацягвае прыёмку.

Акрамя таго, збожжа прымаецца на другім паверсе. Прыходзіцца пяціпудовыя мяшкі ў гару цягнуць на плячох. Увечары на пункце ня было ні электрычнасьці, ні ліхтароў. Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што прыёмка збожжа ў Бабруйску не арганізавана, што нічога ня зроблена для таго, каб палепшыць абслугоўваньне здатчыкаў.

К. КАРОЛЬ.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» паведамляла ўжо аб вельмі дрэнным становішчы з аховай складаў Загатзбожжа ў Бабруйску. У гэтай карэспандэнцыі паказана зусім нездавальняючае становішча з прыёмкай прадукцыі. Бабруйская РКК-РСІ павінна неадкладна заняцца праверкай складаў і прыёмачных пунктаў Загатзбожжа.

Усебеларускі конкурс ССТ

ЧАМУ Ў СМАЛЯВІЦКІХ КРАМАХ ПУСТЫЯ ПАЛІЦЫ?

Сельспажыўтаварыствы Смалявіцкага раёну прымацаваны непасрэдна да менскай міжраённай базы БКС і баз прамысловасьці. Гэта стварае асабліва спрыючыя ўмовы для паспяховага выкананьня пляну гаваразвароту.

Аднак, сельспажыўтаварыствы Смалявіцкага раёну сарвалі ажыцьцяўленьне пляну таваразвароту. Ёсьць рад гаварыстваў, дзе заданьне выканана на 20-25 проц. Нават такое сельспажыўтаварыства, як Смалявіцкае, дало каля 40 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што Смалявіцкая каапэрацыя ігнаруе дырэктывы аб абслугоўваньні ўборачнай і збожжапаставак. У сельспажыўтаварыствах вы ня знойдзеце такіх тавараў як соль, запалкі, газа. Іх няма нават у апорным Амяльянаўскім сельсавеце.

Райспажыўсаюз, замест таго каб мабілізаваць усе сілы на разгортваньне таваразвароту, займаецца складаньнем зводак і фіксацыяй прарываў. Старшыня райсаюзу **Вайнэр** лічыць, што спабжэньне сельспажыўтаварыстваў таварамі—ня справа РСС, гэтым павінны займацца базы.

Характэрна, што пры адсутнасьці солі ў сельспажыўтаварыствах райсаюз практыкаваў продаж солі проста з вагону ўсім, хто хоча.

Так ён «клапоціцца» аб разгортваньні таваразвароту сельспажыўтаварыствамі, аб іх рэнтабельнасьці, аб бесьперабойным спабжэньні калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Аб дрэннай рабоце апарату райспажыўсаюзу гаворыць і наступны факт. Райза затрымлівае разрахункі з нізоўкай з-за адсутнасьці грошай, у той-жа час загадчык складу **Барадзін** затрымлівае цэлы месяц рахункі па адпраўленыя розным арганізацыям малочныя прадукты на суму ў 32.000 руб.

Нельга абыйсьці дрэннай работы менскай міжраённай базы Белкаапсаюзу і баз прамысловасьці. Менская база заключыла дагаворы з ССТ на снабжэньне іх таварамі. Але яе абавязацельствы засталіся на паперы. База ня выконвае дагавароў. Сельспажыўтаварыствы прыедуць на базу па тавары і вымушаны ехаць назад з пустымі рукамі. База фармальна перабудавала сваю работу, але такая перабудова зьяўляецца простым зьдзекаваньнем над савецкім гандлем.

Зусім нездавальняюча абслугоўваюць нізавую каапэрацыю і базы прамысловасьці. У паасобных базах пануюць спэкуляцыйна-нэпманскія тэндэнцыі. База Скурспабзбыту пры водпуску дзіцячага абутку Смалявіцкаму сельспажыўтаварыству ўстанавіла цану—31 р. 50 к. за пару, замест 16 р. 65 к. Абутак доўгі час ляжаў на базе райсаюзу, бо ніхто не хацеў яго браць па такой высокай цане. Акрамя таго база недадала 75 пар абутку. Справай аб гэтым жульніцтве павінна заняцца пракуратура.

Даныя аб рабоце смалявіцкага райспажыўсаюзу паказваюць, што раённыя арганізацыі ня ўлічылі ўрокаў, якія выцякаюць з пастановы ЦК КП(б)Б па дакладах двух сельспажыўтаварыстваў Касьцюковіцкага раёну.

Б.

Спэкулянты з каапэрацыі

Нядаўна загадчык магазыну № 10 БГА Белкаапсаюзу ў Менску МІХЕЛЬСОН, прадстаўнікі ЗРК мэталістаў і станцыйнага буфэту ў Віцебску закупілі ў невядомага разьязнога агента вялікую колькасьць тавараў (ірысаў). Тавары былі вельмі нізкай якасьці, за іх заплачана па 48 руб. за кілёграм, у той час як цана дзяржаўнай прамысловасьці — ня звыш 3 руб. кілё.

Пры закупцы ніхто не праверыў, прадстаўніком якой арганізацыі разьяздны агент зьяўляецца, ніхто не пацікавіўся тым, каб запатрабаваць у яго дакументы.

Аказалася, што агент зьяўляўся прадстаўніком прыватнага прадпрыемства, якое пад шыльдай прамарцелі «Аўрора» (у Кіеве) прадавала каапэрацыі сваю прадукцыю.

Гэты факт сьведчыць аб страце клясавай пільнасьці паасобнымі работнікамі каапэрацыйных арганізацый, аб грубым скажэньні прынцыпаў савецкага гандлю.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК-РСІ пастанавілі АДДАЦЬ ПАД СУД І ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ ЗАГАДЧЫКА КРАМЫ № 10 БГА БЕЛКААПСАЮЗУ МІХЕЛЬСОНА (былога гандляра).

Віцебскай НК-РСІ даручана прыцягнуць да суровай адказнасьці тых работнікаў ЗРК мэталістаў і станцыйнага буфэту ў Віцебску, якія закупілі товар у прыватніка.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК-РСІ завастрылі ўвагу ўсіх гандлюючых арганізацый на неабходнасьці павышэньня клясавай пільнасьці ў разгортваньні савецкага гандлю і жорсткай барацьбы з усякімі праявамі спэкуляцыйна-нэпманскіх тэндэнцый.

У барацьбе за высокую якасьць дарожных работ

Выязная рэдакцыя «Зьвязды» на дарожным будаўніцтве шмат разоў сыгналізавала аб тым, што рад інжынэрна-тэхнічных работнікаў АДПР-4 у сваёй рабоце ня прытрымліваюцца элемэнтарных тэхнічных правіл, наносячы гэтым вялікую шкоду якасьці новай дарогі.

На вучастку прараба 4 тэхнік Матросаў (зьняты з работы пасьля патрабаваньня выязной рэдакцыі) займаўся сыстэматычным шкодніцтвам. Земляное палатно на вучастку Матросава было пакрыта рэшткамі расьлін, карчамі і г. д. У выніку атрымалася тое, што на 105-106 клм. пры выпрабаваньні кій праходзіў праз укладзены пакеляж на мэтр уніз. Дарога на гэтых кілёмэтрах не папраўлена і дагэтуль.

На вучастку прараба 2 Мэрзьляке тэхнічна няправільна зроблен рад работ. Няправільна ўкладзен дробны пакеляж (56 клм.), няправільна зроблена прафілёўка (55 клм.), пуск каткоў праводзіўся па дарозе з няправільным профілем і інш.

Адсутнасьць тэхкіраўніцтва, адсутнасьць тэхкантролю—характэрныя рысы для ўсёй работы АДПР-4 і, у прыватнасьці, для работы па вучастку прараба-1 Пятрова.

Выязная рэдакцыя газэты «Зьвязда» яшчэ ў пачатку жніўня (№ 45) пісала аб глыбокім прарыве ў якасьці работы на шасэйным вучастку дарогі прараба—1 Пятрова. У яго з самага пачатку будаваньня шасэ пануе абязьлічка, няма паўных людзей, якія-б несьлі персанальную адказнасьць за тэхнічную правільнасьць праведзеньня работы.

Карыта, на якім будуецца шасэ не ўтрамбоўвалася. Разам са шчэбнем, які засыпаўся ў карыта, трапляла туды круглае, буйнае камяньне. Асабліва заўважаецца гэта на 9-м клм.

Паліўка шчэбенкі і расклінцоўкі перад укаткай праводзілася самым злачынным парадкам. У бочак ня было размывальнікаў, патрэбных для таго, каб палатно палівалася роўнамерна. Вада з бочак цякла проста струменямі. Атрымліваліся сухія плямы—«стрэлкі». Часта бочкі ішлі ў адзін бок, а каткі—у другі, і пакуль каткі даходзілі да палітага месца—яно абсыхала.

У выніку гэтых і іншых тэхнічных няправільнасьцяй на сёньняшні дзень большая частка шасэ сапсавана. Асабліва выразна гэта заўважаецца на 5-6 клм., дзе шчабёнка і верхняя расклінцоўка ў выніку сухой ўкаткі акругліліся і свабодна разьбіраюцца рукамі. У першыя-ж дні эксплёатацыі гэтага шасэ яны разбураюцца.

Як-жа рэагавала на сыгналы выязной рэдакцыі «Зьвязды» кіраўніцтва АДПР—4?

Пасьля зьяўленьня артыкулу «Шасэ сапсавана» АДПР-4 была створана спэцыяльная камісія ў складзе т. т. Кобызева (нач. АДПР—4), Зіньковіча—(старш. інж. АДПР-4), Пятрова—(прараб—1), Кісуля—(прараб мэханізацыі), Усава — (партарганізатар АДПР—4) і Макровіча (нач. сэктару капітальнага буд-ва Галоўдартрансу БССР). Прадстаўніка выязной рэдакцыі ў складзе камісіі ня было.

Такім чынам, камісія цалкам складалася з людзей, якія фактычна нясуць адказнасьць за якасьць работы, за ўсю работу на АДПР-4.

Што магла прызнаць гэткая камісія?

Яна «прызнала», што матар'ял газэты часткова пацьвердзіўся, якасьць шасэ наогул «здавальняючая», а толькі 900 пагонных мэтраў патрабуюць перарóбкі.

Нічога іншага ад гэтай «камісіі» і чакаць ня можна было. «Устанавіўшы», што 900 п. м. шасэ нездавальняючыя, камісія гэтым і абмежавалася, ня ўскрыла прычыны дрэннай якасьці работы, не зрабіла ніякіх вывадаў, — адным словам, ня ўзьняла справу на належную палітычную вышыню, а фактычна пастаралася змазаць яе.

Выязная рэдакцыя «Зьвязды» зьмясьціла рэзкі артыкул з пратэстам супроць такога «рэагаваньня» на важнейшыя матар'ялы і патрабавала прызначэньня да агляду шасэ аўтарытэтнай камісіяй з цэнтру (№ 52, арт. пад назвай «И щуку бросили в реку»).

Начальнік АДПР—4 т. Кобызеў, прызнаўшы «частковую» правільнасьць матар'ялаў газэты, тым ня менш патрывожан «недалікатнай» настойлівасьцю выязной рэдакцыі.

Другі член камісіі т. Усаў, які зьяўляецца партарганізатарам АДПР-4, у гэты-ж самы час вядзе размовы аб тым, што патрэбна выклікаць рэдактара выязной газэты «Зьвязда» на бюро ячэйкі і патрабаваць ад яго «тлумачэньняў».

Ня трэба, было, бачыце, выносіць сьмяцьцё з хаты.

Аб чым гэта гаворыць?

Перш за ўсё гэта гаворыць аб тым, што партарганізатар АДПР—4 аб'ектыўна стаў на шлях заціску бальшавіцкай крытыкі, на шлях фактычнага падтрымання асоб, якія павінны былі-б адказваць за якасьць шасэ і якія імкнуцца зваліць з сваіх плеч гэтую адказнасьць, вамагаўшы сутнасьць злачыннай работы на шасэ, зьвёўшы яе да вызначэньня «памылак» тэхнічнага характару.

Да рэчы, аб партрабоце на АДПР-4. Яна не стаіць на вышыні тых задач, якія вымагае пасьпяховасьць разгортваньня і завяршэньня барацьбы за сваячасовае выкананьне пляну.

Яшчэ 30-га чэрвеня партнарада АДПР-4 прыняла пастанову: і сацспаборніцтва ў ёй, як правіла, успомнена, і ўдарніцтва, і чырвоныя ды чорныя дошкі, і сыстэматычнае праведзеньне палітгаварак з рабочымі, і грамадзкія суды над зрыўшчыкамі якасных паказальнікаў, і штодзённыя 15-хвілінныя вытворчыя нарады ва ўсіх брыгадах па абмеркаваньні недахопаў у рабоце папярэдняга дня і задач на наступны дзень. Занадта многа добрых пунктаў мела пастанова. Узяць хаця-бы штодзённыя 15-хвілінныя вытворчыя нарады. Практычнае праведзеньне гэтага пункту ў значнай меры вырашала-б задачу барацьбы за якасьць работы. Аднак, пастанова ў даным пункце засталася нявыкананай. Наладжваньне грамадзкіх судоў над зрыўшчыкамі якасных паказальнікаў адыграла-б ня менш вялікую ролю ў справе ўзьняцця якасьці работы на дарозе, у паскарэньні тэмпаў і ліквідаваньні адстаючых. Аднак, і гэты пункт пастановы астаўся на паперы. Між тым, пастанова ўжо тады канстатавала, што **«па раду прарабскіх вучасткаў, якасьць работы (укладка пакеляжу, бруказаньне, укатка) зьяўляецца крайне нездавальняючай».** Партыйная нарада была арыентавана на сканчэньне дарогі да 1 жніўня. Гэты тэрмін ня быў вытрыман. Таксама табелі былі правалены і тры наступныя тэрміны — 15—20—25 жніўня.

Аб чым гавораць гэтыя факты? Перш за ўсё аб тым, што кіраўніцтва АДПР-4 ня здолела забясьпечыць выкананьня ўласнаю рукою намечаных пляноў, па-другое, аб тым, што партарганізацыя АДПР-4 ня здолела крытычна падысьці да пляноў кіраўніцтва вучастку, ня здолела правільна расставіць свае сілы з тым, каб стаць на чале барацьбы за плян.

Характэрна для ўсяго стану партработы, што большасьць партыйцаў і камсамольцаў АДПР-4 ня ведаюць нават зьместу пастановы ЦК і СНК аб дарожным будаўніцтве. Ня дзіва пасьля гэтага, што пастановы не даведзены да рабочых і калгасьнікаў. Члены партыі і камсамольцы АДПР-4 ня ведалі і ня ведаюць канкрэтных заданьняў, за выкананьне якіх яны павінны змагацца кожны дзень, кожную гадзіну. Партарганізацыя не перанесла прапрацоўку важнейшых пастаноў ЦК і СНК на лінію ў масы рабочых, у сельсаветы, у масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў. Вынікі гэтага — самацёк у рабоце, недаведзеньне заданьняў, невыкананьне норм выпрацоўкі, абыякавыя адносіны да работы з боку ўсіх катэгорый работнікаў дарогі. Агульную інэртнасьць паглыбляла і амаль поўная адсутнасьць партыйных сходаў па АДПР-4.

На матар'ялы, якія зьмяшчаліся ў газэце выязной рэдакцыі «Зьвязда», ні парткіраўніцтва, ні адміністрацыя вучастку да апошняга часу ніяк не рэагавала.

Наблізіцца чыстка. І парторг, і партячэйка прараба-1 на чале з сакратаром Берковічам падрыхтоўку да чысткі партыі літаральна праспалі.

Толькі адсутнасьцю бальшавіцкай пільнасьці можна растлумачыць тое, што ў апараце раду прарабстваў працуюць клясава-варожыя элемэнты, якія ўсе сілы накіроўваюць на тое, каб сарваць выкананьне пляноў дарожнага будаўніцтва. На вучастку прараба-3 Бэрманскага на пасадзе табельшчыкаў, старшых рабочых, рахункаводаў працавалі кулакі Дашукевіч, Пісарык, кулацкі агент «студэнт» Полацкага лесатэхнікуму Браноцкі, які нікодзіў рабоце, заблытваў улік выкарыстаньня гужавой і пешай рабочай сілы. Прараб мэханработ Кісуля — непасрэдны вінаўнік у шкодніцкай рабоце на шасэ — сын царскага жандара. Начальнік 6-га аўтаатраду Шафранскі — п'яніца, растратчык дзяржаўных грошай. Гэты самы Шафранскі для таго, каб пакрыць зробленую ім растрату, паехаў на атрадаўскай машыне ў Віцебск, дзе і эксплёатаваў яе на працягу некалькіх дзён, у выніку чаго ўзьлёс 8 растрачаных 2.900 рублі. грошай — 1.130 рубл.

Усё гэта робіцца пад носам кіраўніцтва партарганізацыі, якое не заўважае, ці ня хоча заўважыць нічога злачыннага ні ў дзеяньнях Шафранскага, ні ў дзеяньнях прараба Бэрманскага, які грае тэрмінамі сканчэньня свайго вучастку, як клёўн з мячыкамі. Пад носам у партарганізатара АДПР-4 у аўтаатрадзе № 6 выязной рэдакцыяй «Зьвязда» была выкрыта контр-рэвалюцыйная група рвачоў і разлажэнцаў. Самы чынны ўдзел у «рабоце», якой прымаў кандыдат КП(б)Б Корсак. Бюро ячэйкі вынесла яму... вымову.

Слабасьцю партыйнай работы трэба тлумачыць і слабасьць, лепш сказаць, адсутнасьць прафсаюзнай работы на АДПР-4.

На перавыбарах вучастковага камітэту, якія адбыліся ў канцы ліпеня, лепшыя ўдарнікі дарожнага будаўніцтва жорстка крытыкавалі работу вучасткому. Аднак, і зараз справа не палепшылася. Культмасавая работа на вучастку адсутнічае, няма чырвоных куткоў, радыёўстановак, бібліятэчак. Рабочыя цэлымі тыднямі ня бачаць цэнтральных газэт. Вучастком не зьвяртае абсалютна ніякай увагі на палепшэньне культурна-бытавых умоў рабочых. Зусім адсутнічае ўлік ударнікаў на вучастку. Вучастком не праводзіць ніякай работы па ўцягненьні рабочых у рады ўдарнікаў, па разгортваньні сярод іх сацыялістычнага спаборніцтва. Старшыня вучасткому т. Жыдовіч займаецца чым хочаце, толькі не прафсаюзнай работай, аб стане якой надзвычай яскрава сьведчыць той факт, што работнікі вучасткому нават прыблізна ня ведаюць, колькі ёсьць на вучастку членаў саюзу і т. д. Запазычанасьць па выплаце прафсаюзных членскіх узносаў дасягае 6-8 месяцаў.

Намесьнік начальніка Галоўдартрансу БССР тав. Іваноў «кіруе» работай АДПР-4 з аўтамабільнай кабінкі. Калі АДПР-4 апынуўся ў глыбачэзным прарыве, Іваноў стварыў па палове прарабстваў так званыя «апэрацыйныя штабы», якія «засядаюць» рэгулярна праз дзень. Характэрна, што штабы ня здолелі забясьпечыць выкананьня сваіх уласных загадаў, гэтым самым ужо з першых дзён свайго існаваньня падарваўшы свой аўтарытэт. Для характарыстыкі якасьці апарату АДПР-4, якасьці работнікаў ГДТ, якія «дапамагаюць» рабоце вучастку, патрэбна прывесьці наступныя факты: У аўтаатрадзе 7 прыкамандыраваны былі студэнты Менскага і гомельскага аўтадарожных тэхнікумаў. Паміж асобнымі студэнтамі вяваліся склокі. У мэтах спыненьня ўсякіх размоў, аздараўленьня настрояў і ўзьняцьця працаздольнасьці атраду бюро парт'ячэйкі, а потым агульны сход ячэйкі пастанавіў: перакінуць двух студэнтаў (Рубенчык, Раманчук) у аўтаатрад № 6. Начальнік транспартнай канторы Галоўдартрансу тав. Тарасэвіч, ажыцьцяўляючы пастанову парт'ячэйкі, даў загад перавесьці гэтых таварышоў у 6 атрад.

Але...

Парторг Галоўдартрансу Грознэр невядома па якіх прычынах скасаваў пастанову ячэйкі і загад Тарасэвіча.

Не апошнім па важнасьці пытаньнем зьяўляецца нікуды ня вартая пастаноўка работы грамадзкага харчаваньня і дарожнай каапэрацыі. Сталовыя, як правіла, не спраўляюцца са сваімі задачамі. Якасьць абедаў скрозь нявысокая.

Аб якасьці апарату Бабруйскага ДРК сьведчыць ужо хаця-бы сабе той факт, што пасьля доўгіх патрабаваньняў выязной рэдакцыі праўленьне ДРК пастанавіла зьняць з працы працаўніцу крамы Гарадзенскую. Выканаць гэтую пастанову павінен быў упаўнаважаны ДРК Пажарын, які нічога не зрабіў для таго, каб выканаць пастанову праўленьня. Гарадзенская яшчэ і сёньня працуе ў Палікарпаўскай краме ДРК.

Пасьля ўсяго прыведзенага становіцца зразумелым, чаму АДПР-4 апынуўся ў такім глыбокім прарыве. Бессыстэмнасьць і бясплянавасьць у рабоце, адсутнасьць выразнай работы ўсіх зьвеньняў вучастковага апарату, адсутнасьць правільнага сыстэматычнага кіраўніцтва вучасткам зьверху, засмечанасьць апаратаў прарабстваў клясава варожымі элемэнтамі — вось што прывяло АДПР-4 да прарыву. Няправільная расстаноўка і выкарыстаньне пешай і коннай рабочай сілы і мэханізмаў (брыгада Каласкова мае каля месяца прастою, сыстэматычныя прастоі інш. брыгад — паглыбляюць гэты прарыў.

Для таго, каб вывесьці АДПР-4 з прарыву, для таго, каб з максымальнай эфэктыўнасьцю скарыстаць час, што яшчэ застаўся да канца дарожнага будаўнічага сэзону, патрэбна неадкладна ачысьціць апарат вучастку ад клясава варожых элемэнтаў, якія праводзяць шкодніцкую работу з мэтай сарваць выкананьне пляну дарбудаўніцтва, сурова пакараўшы вінаватых у псаваньні шасэ на вучастку прараба № 1.

Важнейшай прадпасылкай пасьпяховага выкананьня пляну работ АДПР-4 зьявіцца карэнная перабудова партработы, разгортваньне культурна-масавай работы сярод рабочых-дарожнікаў, неадкладнае выпраўленьне дапушчаных памылак.

Выязная рэдакцыя «Зьвязды»: А. ЛЕВІН, Я. ЛОМАХ, М. БАГУН, Т. КЛЯШТОРНЫ, Ф. СУШЭЎСКІ, брыгадзір ЦК КП(б)Б Р. МУРАШКА.

Перад працэсам аб падпале рэйхстагу

КРАХ ВЫМЫСЛАЎ ЭРТА

ВЫМУШАНАЕ ПРЫЗНАНЬНЕ „БЕРЛІНЕР БЕРЗЕН ЦЕЙТУНГ"

БЕРЛІН, 14. (БЕЛТА).

Каментуючы магчымае быць пасяджэньне міжнароднай камісіі юрыстаў па пытаньні аб падпале рэйхстага «Крэй цэйтунг» выказвае незадаволеньне тым, што першае адкрытае пасяджэньне камісіі юрыстаў будзе адбывацца ў будынку саюза ангельскіх юрыстаў.

Газета прабуе ўмаліць значэньне контр-працэса тым, што, мол, члены камісіі з'яўляюцца прыхільнікамі левых палітычных плыняў: французскія адвакаты Берджэры і Маро Джыеферы—левыя адвакаты, Брайтынг—соцыяліст, ангельскі адвакат Прыт у сваёй кнізе «ўсхваляў совецкую юстыцыю». Ангельская журналістка Вількінсон—«лева-соцыялістычны дэпутат парламента», а ангельскі адвакат Крыпс выступаў супроць умяшаньня ангельскага ўрада ў ход маскоўскага працэса ангельскіх інжынераў.

**

БЕРЛІН, 14. (БЕЛТА).

Нацыянал-соцыялісты разьлічвалі, што ім удасца, дзякуючы кнізе Эрта аб «узброеным паўстаньні», нібыта падрыхтаваным германскай компартыяй, перакапаць рэакцыйныя колы ўсіх краін у «гістарычнай місіі германскага нацыянал-соцыялізма», у барацьбе супроць «комуністычнай небясьпекі».

Аднак надзеі не спраўдзіліся. КРУШЭНЬНЕ РАЗЛІКАЎ ВЫМУШАНА ПРЫЗНАЦЬ «БЕРЛІНЕР БЕРЗЕН ЦЭЙТУНГ», якая канстатуе, што «СУСВЕТНЫ ДРУК МАЎЧЫЦЬ» аб «выкрыцьцях», якія змяшчаюцца ў кнізе Эрта.

З гэтага правала газета робіць вывад, што неабходна «мабілізаваць усіх германскіх грамадзян, якія маюць якія-небудзь сувязі з заграніцай для распаўсюджаньня заграніцай праўды аб становішчы ў Германіі».

БАНКРУЦТВА „ВАРШАЎСКАГА МІЖНАРОДНАГА БАНКА"

ВАРВАВА, 13. (БЕЛТА).

Вялікае ўражаньне ў фінансавых колах выклікала банкруцтва «Варшаўскага міжнароднага банка», цесна зьвязанага з лодзінскай тэкстыльнай прамысловасцю і ў першую чаргу з буйнейшымі тэкстыльнымі прадпрыемствамі «Шайблер і Громан».

П'ЕР КОТ ПРЫБЫЎ У СССР

КІЕЎ, 13. (БЕЛТА).

Сёньня ў Кіеў прыляцела французская эскадрыльля ў складзе трох самалётаў «Дэвуатын», «Віво», «Блох» на чале з міністрам авіяцыі п. П'ЕРАМ КОТ.

Для сустрэчы гасцей сабраліся: старшыня кіеўскага аблвыканкома тав. Васіленка, яго намесьнік тав. Багуцкі, старшыня гарсовета тав. Быструкоў, дыплёматычны агент наркамата замежных спраў тав. Шэнлэў, начальнік гарнізона—камандзір корпуса тав. Тураўскі, начальнік штаба корпуса тав. Бутырскі, камандзір авіябрыгады тав. Астахаў і іншыя прадстаўнікі вышэйшага камандаваньня.

У 17 гадзін 50 мінут французскія аэрапланы паказаліся над аэрадромам і плаўна пайшлі на пасадку. Аркестр грае французскі нацыянальны гімн. З кабіны выходзяць міністр авіяцыі п. П'ер Кот, генерал—інспектар авіяцыі п. Барэс, начальнік габінета міністэрства авіяцыі п. Агно, яго памочнік п. Жокс, начальнік тэхнічнага кіраўніцтва міністэрства авіяцыі п. Како, асабісты сакратар міністра п. Дэгранж, начальнік ваеннага габінета міністэрства авіяцыі палкоўнік Жано і інш.

Пасьля абмена прывітаньнямі міністр авіяцыі, яго спадарожнікі, прадстаўнікі вышэйшага камандаваньня і ўлады абходзяць ганаровую варту, якую затым прапускаюць цэрэманіяльным маршам. Затым госці накіроўваюцца ў горад.

У фашысцкай Германіі

НА ШЛЯХУ ДА СЯРЭДНЯВЯКОЎ'Я

ТЭХНІЧНЫ РЭГРЭС ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ

УРАД ЗАБАРАНЯЕ УСТАНОЎКУ НОВЫХ МАШЫН

ЛЮНДАН, 13. (БЕЛТА).

Міжнароднае бюро працы апублікавала падрабязнасці некаторых мер нацыянал-соцыялісцкага ўрада ў Германіі па **АБМЕЖАВАНЬНІ СКАРЫСТАННЯ МАШЫН У ПРАМЫСЛОВАСЦІ**. Гэтыя меры, якія праводзяцца пад флагам «барацьбы з беспрацоўем» ілюструюць **ТЭХНІЧНЫ РЭГРЭС** фашысцкай Германіі.

15-га ліпеня германскі ўрад **ЗАБАРАНІЎ УСТАНОЎКУ НОВЫХ МАШЫН** для выраба сігар і аднаўленьне работы машын, ужо ўстаноўленых, але не працуючых.

Аднначасова дэкрэт прадугледжвае субсідываньне прадпрыемстваў, якія адмовяцца ад скарыстаньня машын і пяройдуць на ручную працу, а таксама субсідываньне машынабудаўнічых прадпрыемстваў для кампенсацыі іх страт.

Яшчэ больш радыкальныя меры былі прыняты ў Турынгіі. Там улады не толькі забаранілі ўстаноўку новых машын для вытворчасці шкляных вырабаў для хімічных і фармацэўтычных мэтаў, але абмежавалі работу кожнай ужо ўстаноўленай машыны 48 гадзінамі ў тыдзень.

ДЭМАГОГІЯ ЗАМЕСТ ДАПАМОГІ

БЕРЛІН, 13 (БЕЛТА).

У прадбачаньні цяжкай зімы міністэрства прапаганды наладзіла сход, прысвечаны пытаньню аб «барацьбе ў зімовы перыяд супроць голада і холада».

Міністр прапаганды **ГЕБЕЛЬС** выступіў з дакладам аб планах міністэрства прапаганды. У якасьці меры «барацьбы супроць голада і холада» Гебельс рэкамендуе: У першую нядзелю кожнага месяца кожны павінен абмежавацца адною стравою ў 50 пфенінгаў, а атрыманыя ад гэтага «зберажэньні» здаваць у агульную касу для дапамогі галадаючым.

Акрамя таго, у дапамогу галадаючым будуць арганізаваны скарбонавыя зборы. Для гэтых збораў прыцягваюцца ўласьнікі магазінаў і іншых прадпрыемстваў, якія робяць добраахвотны ўзнос на гэтыя мэты. Усе гэтыя меры па збору ахвяраваньняў Гебельс ахарактарызаваў як «грандыёзную соцыяльную меру».

**

БЕРЛІН, 13. (БЕЛТА).

Як паведамляе «Берлінер тагеблат», пачаўся продаж з аўкцыёну збанкрутаваўшага некалькі месяцаў назад буйнага выдавецтва «Рудольф Моссе».

АДКРЫТАЯ ПРАПАГАНДА ВАЙНЫ

БЕРЛІН, 12 (БЕЛТА).

У сувязі з папярэднімі перагаворамі па раззбраеньні ў Парыжы і надыходзячым пачаткам жэнэўскай канферэнцыі, «Берлінер берзэн цэйтунг» лічыць, што галоўная небясьпека для Германіі пагражае з боку Францыі, якая стараецца ізаляваць Германію. Аднак, на думку газеты, рад момантаў зьвязвае ў гэтых адносінах свабоду дзеяньняў Францыі. Газета стараецца перакапаць французскія ўрадавыя колы, што зблізкэньне з Совецкім саюзам — шкодна інтарэсам Францыі.

«Не гледзячы на ўсё, — пытаецца газета, — ці не трэба лічыць французскіх дзяржаўных дзеячоў досыць разумнымі, каб яны не закрывалі вачэй на небясьпекі для ўласнага дзяржаўнага парадка, якія павінен выклікаць эўрапэйскі пажар? Чырвоныя арміі, якія маршыруюць на Захад замест Усхода, пагражаюць усякаму традыцыйнаму палітычнаму парадку і Сярэдняй і Заходняй Эўропы».

«З прычыны палітычных небясьпек сусьветнага значэньня, якія навісаюць над усім эўрапэйскім культурным светам, — піша газета, — у будучым маглі-б мець сэнс толькі тыя войны ў Эўропе, у якіх магла-б прыняць удзел новая Германія цаною свайго поўнага роўнапраўя.

Германія мае ўсе падставы чакаць псіхалёгічнага момента, калі яна зможа патрабаваць поўнага задавальненьня».

РЭВАНШЫСЦКАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ НАЦ-СОЦЫЯЛІСТАЎ

ПАРЫЖ, 12. (БЕЛТА).

Страсбургскі карэспандэнт «Эко дэ Пары» паведамляе, што на нацыянал-сацыялісцкім зьезьдзе ў Нюрэнбэргу пры ўручэньні сьцягаў некаторым новасфармаваным батальёнам штурмавікоў атраду гораду Кёльну быў уручан сьцяг з арлом і свастыкай і наступным надпісам: «Страсбург, Германія помніць пра цябе. Германія абудзіся».

«Эко дэ Пары» рэзка камэнтуе гэты факт, як распальваньне рэваншысцкіх настрояў і пагрозу для Францыі. Газэта патрабуе афіцыяльнага выступленьня Францыі ў Бэрліне.

БАРАЦЬБА ЗА ШЛЕЗЬВІГ

ПАРЫЖ. (Уласн. інфармацыя «Зьвязды»).

Пытаньне аб Шлезьвігу стала цяпер у цэнтры ўзаемаадносін паміж Даніяй і Германіяй.

Пасьля плебісцыту 1920 году Паўночны Шлезьвіг перайшоў да Даніі. Са 178 тысяч насельніцтва гэтай вобласьці 150 тысяч зьяўляюцца датчанамі. На апошніх выбарах у парлямант у 1932 г. нямецкая партыя атрымала ўсяго 13,5 проц. галасоў.

З моманту прыходу ў Германіі да ўлады нацыянал-сацыялістаў у дацкім Шлезьвігу ўзмацніўся фашысцкі рух. Мясцовыя нацыянал-сацыялісты, пры падтрыманьні германскіх агентаў, пачалі ўзмоцненую прапаганду на карысьць звароту Шлезьвігу да Германіі.

Дацкая сельская гаспадарка перажывае глыбокі крызіс. Дацкі Шлезьвіг снабжаў сваімі прадуктамі пераважна германскі рынак. З таго часу, як германскі ўрад увёў высокія мытныя пошліны на дацкія с.-г. прадукты, экспарт у Германію надзвычай скараціўся, што зараз-жа адбілася на становішчы сялян дацкага Шлезьвігу. Германскія нац.-сацыялісты, скарыстаўшы цяжкае становішча сялян у сваіх палітычных мэтах, стварылі цэлы сэпаратысцкі рух, які імкнецца да адарваньня Паўночнага Шлезьвігу і звароту яго Германіі.

У гор. Флейсбургу, які знаходзіцца на германска-дацкай мяжы, гітлераўцы арганізавалі свой штаб. Адсюль яны накіроўваюць у Данію сваіх эмісараў для арганізацыі фашысцкіх сіл. На самой граніцы імі было арганізавана ваенна-спартыўнае сьвята, у якім прынялі ўдзел таксама і дацкія нацыянал-сацыялісты.

Лідэр германскіх нацыянал-сацыялістаў у дацкім Шлезьвігу пастар Пэпэркорн кінуў лёзунг, што Данія павінна добраахвотна вярнуць Шлезьвіг Германіі. Гэта было-б першым крокам да далучэньня ўсёй Скандынавіі да «Трэцяй імпэрыі». У выпадку адмовы пастар пагражае тым, што «Германія забярэ тэрыторыю, якая перайшла да яе пасьля пруска-дацкай вайны ў 1864 г., калі Шлезьвіг быў далучан да Прусіі».

Германскія фашысты вуснамі дэпутата ў дацкім парлямэнце Шміта «раяць» «сацыялістычнаму» ўраду Даніі задаволіць гэта патрабаваньне, пагражаючы ў праціўлеглым выпадку ўзброеным паўстаньнем.

Фашысты адкрыта вядуць сэпаратысцкую прапаганду, а ўрад Стаўнінга замест таго, каб рэагаваць на гэта, узмацняе барацьбу супроць рэвалюцыйнага пралетарыяту.

Дацкія сацыял-фашысты сарвалі антыфашысцкую забастоўку рабочых у Апенрадзе ў Шлезьвігу, абвешчаную ў знак пратэсту супроць прыходу ў порт германскіх караблёў пад фашысцкім сьцягам. Абвінавачаных у арганізацыі забастоўкі камуністаў яны аддалі трыбуналу. Адзіны фронт рабочых быў сарван прафсаюзнай бюракратыяй. Урад Стаўнінга ідзе па шляху «меншага зла»: апякуючы нацыянал-сацыялістычныя арганізацыі, ён усю сілу сваёй улады накіроўвае на праследваньне рэвалюцыйнага рабочага руху.

Заява Эрыо

ПАРЫЖ, 13. (БЕЛТА).

Эрыо прыбыў у Ліон. Адзначыўшы аказаны яму ў СССР найлепшы прыём, Эрыо заявіў:

«Я канстатаваў у СССР велізарнае імкненьне аўладаць ведамі. Гэта—важны момант, які растлумачвае бліскучыя дасягненьні краіны ва ўсіх галінах, асабліва ў асьвеце і гаспадарчым развіцці.

Спыняючыся на наведваньні Днепрагэс'а і рада совецкіх гарадоў, Эрыо падкрэсьліў вялікія дасягненьні совецкай комунальнай гаспадаркі.

— У прыватнасьці Харкаў,—заявіў ён—у гэтых адносінах узорны горад. На пытаньне аб харчовых цяжкасцях у СССР, Эрыо адказаў: «Трэба асьцерагацца песімістычных вывадаў. Я бачыў жанчын, якія стаялі ў чарзе за газаю. Калі я запытаўся, як гэта ўзгадніць з велізарнай вытворчасцю нафты ў СССР, мне адказалі, што ў сувязі з вялікім ураджаем значная частка нафты расходуецца трактарамі».

Пераходзячы да ўражаньняў аб Украіне, Эрыо сказаў, што яна нагадвае яму дэпартамент Во (адзін з самых багатых [illegible] правінцый ва Францыі).

Абвяргаючы паклёпніцкую хлусьню буржуазнага друку аб жабрацтве на Украіне, Эрыо заявіў, што ён усюды на Украіне сустракаў працавітае насельніцтва. Падвёўшы вынікі ўражаньня, Эрыо сказаў: «Калі спакойна і бесстаронна сачыць за развіццём СССР, дык можна заўважыць, што ён ідзе да таго, каб стаць такой-жа эканамічна магутнай краінай, як ПАЗШ».

У заключэньне Эрыо падкрэсьліў, што сардэчны прыём, аказаны яму ў СССР, выражае прыязныя пачуцці гэтай краіны да Францыі.

„ПРАГЕР ПРЭС" АБ ПАЕЗДЦЫ ЭРЫО Ў СССР

ПРАГА, 13. (БЕЛТА).

Орган міністэрства замежных спраў «Прагер прэс», напомніўшы аб значных рэзультатах першага візіта Эрыо ў СССР у 1922 годзе, зазначае, што новы візіт, з прычыны сучаснага міжнароднага становішча, мае куды большае значэньне.

Газета канстатуе значнае паляпшэньне франка-совецкіх адносін за апошнія тры гады, што цяжка было прадбачыць яшчэ ў 1929 годзе.

«Францыя,—гаворыць газета,—таксама як і заняты соцыялістычным будаўніцтвам Совецкі Саюз мае патрэбу ў забесьпячэньні міра. Паралельна ідучыя палітычныя зьмяненьні Францыі і Совецкага Саюза—падкрэсьлівае газета — могуць быць грунтоўна ўроўнены пры дапамозе эканамічнага супрацоўніцтва, якое ў аднолькава выгаднай для бакоў ступені змагло-б памякчыць сучасны гаспадарчы хаос у Эўропе».

На падставе весткі з бліжэйшага акружэньня Эрыо «Прагер прэс» паведамляе далей, што «ўнутранае становішча ў Совецкім Саюзе, дзякуючы велізарнаму развіццю прамысловага будаўніцтва і энергічным намаганьням у галіне сельскай гаспадаркі, зрабіла на Эрыо глыбокае ўражаньне».

Газета лічыць, што Эрыо рэалізуе гэтыя ўражаньні на карысьць міра ў Эўропе і гаспадарчага ўздыма.

МАГУТНЫ УЗДЫМ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ХВАЛІ У КІТАІ

ШАНХАЙ, 11. (БЕЛТА).

Паводле даных журнала «Чайна-Форум», на працягу аднаго толькі ліпеня ў Кітаі мела месца 17 забастовак, ахапіўшых, паводле далёка няпоўных даных, 25.730 рабочых.

У першай палове бягучага года ў Кітаі мела месца 77 забастовак супроць 63 за гэты-ж перыяд мінулага года, агульная колькасць бастуючых за гэты перыяд выражаецца ў 110.714 чалавек супроць 51.190. Забастовачны рух у гэтым годзе прыняў ярка выражаны наступальны характар. Сусычкі рабочых з паліцыяй у розных цэнтрах сталі звычайнаю з'яваю.

АДСТАЎКА УЦЫДА

ТОКІО, 14. (БЕЛТА).

Як паведамляе Сімбун Рэнго, міністр замежных спраў Уцыда падаў у адстаўку. Намесьнікам Уцыда называюць Хірота.

**

ТОКІО, 14. (БЕЛТА).

Адстаўка міністра замежных спраў Уцыда афіцыяльна тлумачыцца слабым становішчам здароўя, пры чым напамінаюць, што Уцыда ў канцы жніўня ўзяў кароткатэрміновы водпуск па хваробе. Усё-ж у палітычных колах лічаць адстаўку Уцыда нечаканай і, паколькі Уцыда да гэтага часу больш-менш аднадушна лічыўся «слабавольным, «не маючым уласнай лініі замежнай палітыкі», думаюць, што ў сапраўднасці адстаўка выклікана разгалоссямі Уцыда з морскімі і ваеннымі коламі ў ацэнцы міжнароднага становішча і вынікаючых адсюль задач замежнай палітыкі.

У прыватнасці, Уцыда, адлюстроўваючы, як відаць, настроі пэўных колаў, успрыняў апошнія выступленьні ваеннага міністра Аракі і морскага міністра Осумі (якія патрабавалі пастаноўкі пытаньня аб узмацненьні ўзбраеньняў у цэнтр новай «фундаментальнай дзяржаўнай палітыкі»), як выклік па адрасу дзяржаў, што немінуча паглыбіла-б ізаляцыю Японіі. Да таго-ж падкрэсьліваньне ў гэтых выступленьнях «непадрыхтаванасці Японіі да таго, каб справіцца з узрастаючым знешне-палітычным крызісам», было ўспрынята Уцыда, як агульнае асуджэньне зьвязанай з яго імем замежнай палітыкі, наперакор таму, што гэта палітыка фактычна праводзілася пасля згоды з урадам Саіто ў цэлым і ў першую чаргу з морскім і ваенным міністэрствамі.

Між іншым высьвятляецца, што Аракі пасля спатканьня з міністрам фінансаў Такахасі хацеў сустрэцца з Уцыда для абмеркаваньня пытаньняў дзяржаўнай палітыкі, але апошні адмовіўся ад сустрэчы і яшчэ 12 верасьня падаў у адстаўку. Адстаўка была прынята і ў той-жа дзень Саіто пачаў перагаворы з Хірота.

Па ўсіх даных, Хірота быў адзіным кандыдатам на пост міністра замежных спраў, з якім Саіто вёў перагаворы. У палітычных колах лічаць выбар Хірота натуральным, маючы на ўвазе, што ён цесна зьвязан з ваеннымі коламі. Лічаць, што ён карыстаецца давер'ем не толькі ваенных колаў, але і ўплывовых кіруючых дзеячоў рэакцыйных арганізацый, вось чаму ў назначэньні Хірота бачаць узмацненьне ўплыва ваенных колаў ва ўрадзе.

НА КАЛЕНЯХ ПЕРАД АКУПАНТАМІ

ШАНХАЙ, 13. (БЕЛТА).

У палітычных колах указваюць, што канферэнцыя кітайскіх дзеячоў у Кулінэ ўхваліла палітыку «паступовай згоды і аднаўленьня нармальных адносін» з Японіяй, галоўным чынам у той ступені, у якой гэта датычыць становішча ў Паўночным Кітаі.

Нанкінскі міністр фінансаў Сун Цзевэнь падкрэсьліў, што немагчыма пакладацца на дзейснае падтрыманьне эўрапейскіх дзяржаў і ПАЗШ, паколькі справа ідзе аб адносінах Кітая з Японіяй. Гэта перакананьне Сун Цзе-веня паскорыла рашэньне Нанкіна пайсці на збліжэньне з Японіяй.

Нанкінскія ўлады Паўночнага Кітая ўжо разбраілі частку былых войск Чжан Сюэ-ляна і прыступілі да замены няўгоднай японцам адміністрацыі.

**

БЕЙПІН, 12. (БЕЛТА).

На канферэнцыі кітайскіх ваенных лідэраў пастаноўлена расфармаваць каля чвэрці кітайскіх войск, размешчаных у Паўночным Кітаі. Падлягаюць расфармаваньню 5 дывізій, у тым ліку дзве так званыя незалежныя дывізіі былых войск Фын Юй-сяна.

Пабудуем эскадрыльлю імя Кагановіча

Справа ўсіх райкомаў партыі па-бальшавіцку ўзначаліць ініцыятыву мас

Ініцыятыва калгасьнікаў-ударнікаў Гомельшчыны аб зборы сродкаў на пабудову авія-эскадрыльлі імя тав. Кагановіча знайшла шырокі водгук сярод працоўных мас савецкай Беларусі. Рабочыя прадпрыемстваў, служачыя і калгасьнікі добра разумеючы важнасьць умацаваньня абароназдольнасьці нашай краіны, добраахвотна робяць адлічэньні ад свайго заробку. **На 14 верасьня агульны збор па рэспубліцы дасягнуў 785.884 руб., якія цалкам паступілі на бягучы рахунак дзяржбанку.**

Аднак, трэба адзначыць, што тэмпы збору за апошні час значна паслабілі. Бывалі дні, калі на бягучы рахунак паступае ня больш 5-6 тысяч рублёў. Тлумачыцца гэта тым, што многія райкомы і райвыканкомы аслабілі сваю ўвагу да гэтай справы і зусім не займаюцца гэтым пытаньнем.

Узяць, напрыклад, такія раёны, як **Асьвейскі, Вушацкі, Кармянскі, Лельчыцкі, Парыцкі, Тураўскі, Чачэрскі, Чырвонапольскі і Чэрыкаўскі. Яны з самага пачатку кампаніі не сабралі і ня ўнесьлі на бягучы рахунак ні аднаго рубля.**

З такім становішчам мірыцца ў далейшым нельга. Збор сродкаў на пабудову эскадрыльлі мае вялізарнае палітычнае значэньне і недаацэньваць гэтай справы ні ў якім разе нельга. Вакол збору неабходна разгарнуць масавую работу сярод шырокіх мас працоўных. Трэба арганізаваць справу так, каб у бліжэйшыя дні поўнасьцю скончыць збор сродкаў.

Гэтага можна і трэба ва што-б там ні стала дабіцца. **Справа ўсіх партарганізацый па-бальшавіцку ўзначаліць ініцыятыву мас і фарсіраваньнем тэмпамі рухаць збор сродкаў, каб у бліжэйшыя дні яго закончыць.**

На бягучым рахунку—785.889 руб.

За 13 верасьня на бягучы рахунак Дзяржбанку № 160-7814 паступіла ад арганізацый і ўстаноў г. **Менску**: ад гаркасы 259 рублёў, Белсельснабрамонту — 58 рублёў, ад БРК саюзу лесу і сплаву — 13 рублёў, ад школы міліцыі — 157 рублёў і Цэнтральнага дому тэхнікі — 35 рублёў. Паступіла з раёнаў: **Мазырскага** — 5.125 рублёў, **Нараўлянскага** — 741 рубель, **Дубровенскага** — 280 руб. і **Магілеўскага** — 144 руб. За ўвесь дзень паступіла **6.915 рублёў**.

З пачатку збору на бягучым рахунку — 757.488 рублёў.

**

За 14 верасьня на бягучы рахунак паступіла 28.401 руб. Ад арганізацый і ўстаноў г. **Менску** — 364 руб., з раёнаў: **Барысаўскага** — 10.800 руб., **Віцебскага** — 7.823 руб., **Аршанскага** — 3.469 руб., **Рагачоўскага**—3.089 руб.; **Рэчыцкага** — 1.100 руб.; **Жлобінскага** — 707 руб.; **Магілеўскага**—540 руб.; **Полацкага** — 371 руб.; **Асіпавіцкага** — 111 руб. і **Быхаўскага** — 24 руб. Усяго за дзень паступіла **28.401 руб.**

З пачатку збору на бягучы рахунку 785.889 руб.

**

На сёньняшні дзень **Асьвейскі, Вушацкі, Камарынскі, Кармянскі, Лельчыцкі, Парыцкі, Тураўскі, Чачэрскі, Чэрыкаўскі і Чырвонапольскі** раёны ўсё яшчэ ня ўнесьлі ні аднэй капейкі на рахунак дзяржбанку.

Школы не забясьпечаны настаўнікамі

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Навучальны год у вясковых школах Барысаўшчыны хоць і распачаўся з 1 верасьня, але ня ўсюды арганізавана. Мы ў свой час пісалі, што Барысаўскі райАНА ўкамплектаваў школы больш-менш здавальняюча. Але здавальняючай расстаноўка педкадраў аказалася толькі на паперы, бо гэта работа не была падмацавана саюзам працасьветы барацьбой за самазамацаваньне настаўнікаў, клопатамі аб паляпшэньні бытавых умоў настаўніка. У выніку, у цэлы рад школ настаўнікі не зьявіліся на заняткі і ў гэтых школах фактычна заняткі не распачыналіся, або ідуць далёка ненармальна. Так, на 10 верасьня ў **Веляціцкай узорнай ШКМ** на пяць груп 1 канцэнтру ёсьць толькі адзін настаўнік, і дзяцей кожны дзень адпраўлялі да хаты. У **Бараньскай ШКМ** шэсьць груп і на ўсе гэтыя групы быў таксама толькі адзін настаўнік, да рэчы, скончыўшы аднагадовыя педкурсы. РайАНА на дапамогу гэтаму настаўніку 10 верасьня накіраваў яшчэ аднаго, скончыўшага месячныя педкурсы. Як два маладыя, малавопытныя настаўнікі спраўляюцца з работай у 6 групах, з якіх яшчэ дзьве другога канцэнтру — гаварыць шмат ня прыходзіцца. Бараньская ШКМ фактычна не працуе. У Забашэвіцкай ШКМ таксама не зьявіліся 2 настаўнікі 1 канцэнтру. Такое-ж становішча ў Чырвонаслабодзкай ШКМ.

На 10 верасьня па Барысаўскім раёне з-за адсутнасьці настаўнікаў не працавалі **Глівенская аднакамплектная нямецкая школа, астроўская — польская**, у Ратуціцкай 3-камплектнай школе працуе адзін настаўнік: Баярская, Прыямінская, Семянкоўская двохкамплектныя школы маюць па адным настаўніку. Можна прывесьці яшчэ рад фактаў, калі ў паасобных 2-4 камплектных школах нехапае па 1-2 настаўнікаў. Зразумела, пры такіх умовах ня можа быць і гутаркі аб нармальнай рабоце школ. Але такое становішча райАНА і асабліва райкома саюзу працасьветы мала непакоіць.

Трэба проста сказаць, што райком працасьветы не вядзе ніякай барацьбы з лятунамі. Напрыклад, з Забашэвіцкай ШКМ уляцеў Раўнаполец — кандыдат партыі, а з бараньскай ШКМ — загадчык Каваленак — камсамолец. Абодва гэтыя злосныя лятуны выключаны — першы з партыі, а другі з камсамолу. Райком-жа працасьветы да гэтуль ніякіх мер да лятуноў ня прыняў, ён вакол гэтых фактаў дэзэртырства з фронту школьнага будаўніцтва не мабілізаваў шырокіх мас асьветнікаў. Больш таго, РК саюзу зьняў з вучоту лятуна Каваленка, як пераводзячагася на работу ў другі раён. Да рэчы, **сэктар кадраў Наркамасьветы накіраваў Каваленка на работу ў Мазырскі раён.**

На пытаньне старшыні РК працасьветы т. **Крыгману** — чаму саюз не вядзе ніякай барацьбы з лятунамі, атрымалі адказ: «Нам ніхто не перадаваў» (!?). Як гаворыцца, камэнтарыі да такога адказу непатрэбны.

Так далей быць ня можа. Школы Барысаўшчыны могуць і павінны працаваць нармальна. У першую чаргу для ліквідацыі прарыву з педкадрамі трэба скарыстаць курсантаў 8-месячных педагагічных курсаў, па-другое — раённыя арганізацыі абавязаны правярыць і накіраваць у школы настаўнікаў, якія працуюць не па сваёй спэцыяльнасьці, зразумела, тых з іх, якім можна даручыць выхаваньне падрастаючага пакаленьня. І, па-трэцяе, саюз працасьветы павінен разгарнуць работу па самазамацаваньні настаўнікаў, змагацца за ленінскія адносіны да настаўніка, разгарнуць барацьбу са злоснымі лятунамі.

Нельга не спыніцца яшчэ на адным пытаньні. У Барысаве ёсьць цэлы рад спэцыяльных сярэдніх навучальных установаў: педагагічны, [illegible] і сьвінагадоўчы тэхнікумы; ёсьць рабфакі і школы ФЗВ, але трэба проста сказаць, што гэтымі навучальнымі ўстановамі ніхто ня кіруе, не правярае іх работу, яны ў большасьці прадастаўлены самі сабе. Аб гэтых навучальных установах пачынаюць гаварыць і займацца імі толькі тады, калі здараецца які-небудзь палітычны прарыў. Мы лічым, што ў такіх раёнах, як Барысаўскі, трэба ў штат райАНА ўвесьці інспэктара сярэдніх навучальных установаў, на якога ўскласьці ажыццяўленьне мэтадычнага кіраўніцтва і кантролю за работай гэтых установаў. В. П—ны.

Паведамленьне

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б выклікае на 20 вер. г. г., у 5 г. дня, у Менск (Савецкая, 55, памяшк. ЦКК—РСІ) для разгляду апэляцый на рашэньне дзяржынскай райкамісіі па чыстцы наст. т. т.: Курдыбаха Я. С., Аўдзеева М. А., Каткоўскага А. В., Мядзьведзева І. Я.; Касьцова С. І.; Пячэнкіна Я. С.; Краўчука А. С.; Шчакапова Р. К.; Крэсіка А. Я.; Скварчэўскага Я. І.; Жук А. І.; Юрчынскага С. М.

Сакр. рэспубл. камісіі па чыстцы КП(б)Б Касаеў.

Да ведама парткалектываў і ячэек

Культпропам парткалектываў і ячэек неабходна зьявіцца ў горком (пакой 43) для атрыманьня падручнікаў для кандыдацкай школы, а таксама сшыткаў.

КУЛЬТПРОП ГК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ДЗЯРЖЦЫРК. Едзе вядомы дрэсіроўшчык БАРЫС ЭДЭР з групай барбарыйскіх львоў-веліканаў.

ДЗЯРЖЦЫРК

Пачатак у 8 з пал. гадз. веч.

НОВАЯ АТРАКЦЫЁННАЯ ПРАГРАМА

ГАСТРОЛІ ЯПОНСКАЙ ТРУПЫ

КАЦУ—ІЦІ Усходн. жонглеры | ІСІЯМА Ікар. ігры

АД І МАР—сатырыкі | „Людзі Мячыкі" 6 Мясьнюновых

Лос-Амбатос—гімн. | ЛОПЭН-дэ-ЛОП Марціні | Юліанс Універс. артысты

І яшчэ 10 новых нумароў.

„Чырвоная Зорка" Каса—ад 1 г. дня	Замежны мастацкі фільм НІБЕЛУНГІ 1-я сэрыя—„Зігфрыд"
Кіно Інтэрнацыянал	Конрад ВЕЙДТ у фільме, ЦІ ПАВІННЫ МЫ МАЎЧАЦЬ?
Дзіцячы гукавы кіно-тэатр	Мастацкі фільм ЧАНГ (Дзіця джунгляў)
Кіно „Пралетары"	Ад 14 верасьня ІХНЯЯ СУСТРЭЧА
„СПАРТАК" Каса з 3 г. дня	Замежны фантаст. фільм ПАРЫЖ ЗАСНУЎ кіно-раман у 7 частках

Да ведама сэктараў кадраў устаноў і прадпрыемстваў і вучотных працаўнікоў г. Менску

СЭКТАР КАДРАЎ ВОСУ арганізуе на 1933-34 нав. год:

I

8-мес. курсы па павышэньні кваліфікацыі статыстыкаў, рахункаводаў, пам. бухгальтароў і бухгальтароў без адрыву ад вытворчасьці. Прыём да 25 верасьня па камандыроўкам прадпрыемстваў і ўстаноў і за іх кошт. Кошт навучаньня для бухгальтароў—250 рубл., для астатніх груп—200 руб.

II

Курсы па падрыхтоўцы вучотных працаўнікоў для раёну па дагаворам з гаспадарчымі арганізацыямі.

III

6 месячныя курсы рахункаводаў і 4-х месячныя курсы статыстыкаў для гор. Менску на самаакупляце. Кошт навучаньня ад 100 да 150 руб. за ўвесь час. Прыём да 25 верасьня. Прадставіць дакумант: аб сац. становішчы і паходжаньні, аб адукацыі (ня менш 7 груп), аб узросьце і аб памеры пэнсіі. За даведкамі і анкетамі зварачацца ў канцылярыю ВОСУ (Менск, Камуністычная 16, пакой № 10 тэл. 25-345) штодзень на ад 9 да 12 гадз. дня.

ДЫРЭКЦЫЯ.

МЯНЯЮ ПАКОЙ у Магілеве на пакой у МЕНСКУ. Даведацца: вул. Дзяржынскага 4, Гарадзішча з 5 гадзін дня.

ДА ВЕДАМА ГАРКОМАЎ, РАЙКОМАЎ І ЯЧЭЕК МОПР БССР.

З 15 верасьня г.г. снабжэньне ячэек маркамі і білетамі будзе вытвараецца непасрэдна Цэнтральным камітэтам МОПР БССР.

Гаркомы і райкомы МОПР павінны да 18 верасьня зьняць па актах ва ўсіх ячэйках наяўныя маркі і білеты МОПР. Акты складаць у 2-х экз., з якіх адзін высылаць у ЦК МОПР БССР для ўстанаўленьня і высылкі ячэйкам абаротнага фонду; другі застаецца ў ячэйцы разам з наяўнымі маркамі і білетамі МОПР.

Ячэйкі павінны да ўказанага тэрміну выслаць у ЦК МОПР акт наяўнасьці марак і білетаў, без чаго ЦК МОПР ня вышле ячэйкам абаротнага фонду.

Перасылаць мопраўскія сродкі (членскія ўзносы, шэфскі грывеннік, білеты і інш.) на спэцыяльных бланках пераводаў праз пошту, выключна па адрасе ЦК МОПР БССР. Пры падачы пераводу паштовы збор уплачваць з сумы, прызначанай для пераводу; правільна запаўняць бланкі паштовых пераводаў, указаўшы дакладны адрас ячэйкі.

Падрабязныя інструкцыі для ГК, РК і ячэек МОПР, бланкі актаў новых паштовых пераводаў высланы ўсім гаркомам і райкомам МОПР; ячэйкі павінны зьвярнуцца ў свае гаркомы і райкомы за іх атрыманьнем.

Старшыня ЦК МОПР БССР ДОМБАЛЬ.
Кір. фінсэктарам ЛЕВІН.

ВЯЧЭРНІ КАМВУЗ паведамляе, што 16, 17, 19 і 20 верасьня павінны зьявіцца на мандатную камісію і іспыты паступаючыя на І курс ВКУ ад 7 да 9 гадз. веч. Працуючыя па зьменах—ад 10 да 11 гадз. раніцы, у памяшк. ВКСГШ па Універсытэцкай 27, 2-гі паверх, пакой 41. Заняткі на І курсе пачнуцца з 1 кастрычніка.

ВКУ.

БІЯЛЁГІЧНЫ ІНСТЫТУТ Беларускай Акадэміі Навук абвяшчае КОНКУРС на замяшчэньне пасады вучонага спэцыяліста, або старшага навуковага працаўніка па пчалярству для арганізацыі і кіраваньня навукова-дасьледчай работай па пчалярству пры Біялёгічным Інстытуце БелАН.

УМОВЫ АПЛАТЫ:

Для вучонага спэцыяліста ад 400 да 500 руб.

Для старэйшага навук. працаўн. ад 300 да 425 руб., у залежнасьці ад кваліфікацыі і стажа.

Аплата праезду згодна КЗОТ'у.

Заявы з Curriculum vitae, водзывамі ад грамадзкіх арганізацый і дадаткам навуковых прац, накіраваць па адрасе: гор. Менск, Ленінская 29-35, Беларуская Акадэмія Навук, Дырэкцыі Біялёгічнага Інстытуту.

Тэрмін падачы заяў да 15-га кастрычніка 1933 г.

Дырэкцыя Інстытуту.

ЗАВОЧНЫ СЭКТАР РАБФАКУ БДУ паведамляе, што заняткі з новым і старым наборам на ўсіх 4 курсах пачынаюцца з 20 верасьня.

Прыём заяў ад паступаючых на ўсе 4 курсы 20 верасьня будзе спынен.

Паступаючыя будуць залічацца на той ці іншы курс адпаведна дасланых дакумантаў аб асьвеце.

Дырэкцыя.

ЧЭРЫКАЎСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ абвяшчае прыём на трохмесячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы на студэнцкі набор вэттэхнікуму. На курсы прымаюцца скончыўшыя сямігодку—бяз іспытаў і скончыўшыя 6 груп—з іспытамі. Курсанты забясьпечваюцца стыпендыяй (на 65-70 проц.), інтэрнатам і сталоўкай. Прыём заяў з дакумантамі да 25 верасьня г.г. Заняткі з 1 кастрычніка. Заявы і дакументы аб сацстановішчы, асьвеце, узросьце і здароўі і 40 кап. маркамі накіроўваць па адрасе: г. Чэрыкаў, вэттэхнікум.

Дырэкцыя.

ПОЛАЦКІ АЎТА-ТРАКТАРНЫ ТЭХНІКУМ абвяшчае, што АСЕНЬНІ ПРЫЁМ студэнтаў на 1 курс працягнут да 25 верасьня г.г. Дакументы прысылаюцца згодна існуючых правіл. Тэхнікум забясьпечвае інтэрнатам, стыпэндыяй і сталоўкай.

Адкрыт прыём заяў у аўта-трактарную школу: а) на аддзяленьне мэханікаў з вытворчым стажам два—тры гады; б) на аддзяленьне трактарыстаў рулявых. Прыём у школу на базе 4 груп.

Пачатак заняткаў 1 кастрычніка.

Адрас: г. Полацак, Карла Маркса, 43 тэл. 2-67.

Дырэкцыя.

У АДДЗЕЛ АБВЕСТАК ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА" ЗВАНЕЦЕ ПА ТЭЛЕФОНУ 21-360.

ГОС ХИМ.ФАРМ. ЗАВОД „ФАРМАКОН" ЛЕНИНГРАД

КЛИНИЧЕСКИ ИСПЫТАН И ПРИМЕНЯЕТСЯ в ТЕЧЕНИИ 30 лет при неврастении, половом бессилии, старческой слабости, артериосклерозе и малокровии

ПРОДАЖА ВО ВСЕХ АПТЕКАХ И МАГАЗИНАХ САНИТАРИИ И ГИГИЕНЫ С.С.С.Р.

ИМЕЮТСЯ ТАКЖЕ В ПРОДАЖЕ: ОВАРИН, МАМИН, ПЕПТОН, ФОЛИКУЛЕН, ПИТУИТРИН, ТИМОФИЗИН, АСТМОЛИЗИН, ТИРЕОИДИН

СТАРА-БАРЫСАЎСКІ СЬВІНАГАДОЎЧЫ ТЭХНІКУМ абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ на 1-шы курс да 30 верасьня. Пачатак заняткаў з 1 кастрычніка. Правіла прыёму застаюцца ранейшыя.

Дырэкцыя.

Магілеўскі дзенны рабфак пры вэтэрынарным інстытуце абвяшчае, што прыём на ўсе курсы працягваецца да 20 верасьня. Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй. Пачатак іспытаў—10 верасьня г. г., а пачатак заняткаў—15 верасьня г.г. Адрас: Магілеў, Камсамольская, 14 вэтэрынарназоатэхнічны рабфак.

Дырэкцыя.

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Адказны рэдактар—21-353; сакратарыят—21-354, сэктары: сельска-гаспадарчы і нац. культ. будаўніцтва 21-355; партсэктар—21-352; сэктары: прамысловы, транспартны і савецкага будаўніцтва 21-350, [illegible] капіт. і масавай -21-186; замежнай інфармацыі—25-189; бюро расьслед.—21-255; машыннае бюро—21-331; загадчык выдав.—21-358; вучотна-тыражны і сэктар абвестак—21-360; [illegible] выдав.—21-365; друкарня 21-357.

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.